

Днямі адзіная (пакуль) ветраэнергетычная ўстаноўка (ВЭУ) на пляцоўцы каля хутара Грабнікі побач з Навагрудкам «адзначае» свой першы юбілей — год з моманту ўводу ў эксплуатацыю. СТАР. 3



Людзі навукі умеюць з галавой акунуцца ў сваю справу і не звяртаць увагу ні на недахоп часу, ні на жыццёвыя спакусы. Аднак што іх матывуе, кім яны з'яўляюцца ў прыватным жыцці і дзе шукаюць ключы да вялікіх дасягненняў? СТАР. 4



За мяжой чатырохногіх сяброў у апошні шлях праводзяць з шыкам. У Беларусі пахавальны сэрвіс для хатніх жывёл пакуль не развіты. Тым не менш, і ў нас ёсць людзі, якія хацелі б па-чалавечы развітацца са сваімі гадаванцамі. СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 КРАСАВІКА 2012 г. АЎТОРАК № 74 (27189) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПЕРАДАЎ ХРАМУ СВЯТОГА АРХАНГЕЛА МІХАІЛА АБРАЗ БОЖАЙ МАЦІ «ДАСТОЙНА ЁСЦЬ»

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 15 красавіка, у святое свята Вялікадня, па традыцыі наведаў праваслаўную царкву. Ён пабываў у храме святога Архангела Міхаіла ў вёсцы Ляскавічы Петрыкаўскага раёна.**



Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы папрысутнічаў на Велікодным богаслужэнні. Прэзідэнт перадаў у дар храму абраз Божай Маці «Дастойна ёсць». Ён уяўляе сабой копію цудатворнага абраза Божай Маці «Дастойна ёсць», назва якога дадзена па першых радках песнапення, якое са старажытных часоў выконваецца перад ім.

Звяртаючыся да прыхаджан, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Дазвольце мне ў знак велізарнай павагі да вас, а таксама да свяшчэннаслужыцеляў, якія з гонарам і годнасцю нясуць сваю службу і дапамагаюць нашым людзям, асабліва ў гаротныя дні царква заўсёды з народам, падарыць вам вось гэты абраз».

Настаяцель храма ў сваю чаргу падарыў Прэзідэнту фарфоравы ківот з абразом свяціцеля Мікалая Цудатворца.

Аляксандр Лукашэнка запаліў свечку каля абраза Уваскрасення Хрыстовага.

Прэзідэнт у святы дзень Вялікадня звярнуўся да мясцовых жыхароў, а таксама да ўсіх святкуючых Вялікдзень людзей з пажаданнямі дабра, міру, здароўя і любові.

Кіраўнік дзяржавы таксама пагутарыў з прыхаджанамі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Якія б у нас ні былі часы, як бы ні спрабавалі часам зацямніць гэта свята, людзі заўсёды мужна, пераносячы ўсе нягоды, святкавалі гэтыя вялікія святыя дні — як Раждаство Хрыстова, так і Уваскрасенне Хрыстова».

Прэзідэнт сказаў, што з вялікім задавальненнем прыехаў сёння ў храм да прыхаджан у Ляскавічы: «Вы ведаеце маё стаўленне да царквы, да будаўніцтва храмаў. Так, павінны быць і велічныя храмы, але мая любоў — вось да такіх простых храмаў».

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПЕРАКАНАНЫ Ў ДЫНАМІЧНЫМ РАЗВІЦЦІ СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І КУБАЙ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Старшыню Дзяржаўнага Савета і Савета Міністраў Рэспублікі Куба Рауля Кастра і кубінскі народ з 20-годдзем устанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Кубай.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што за гэты перыяд сумеснымі намаганнямі краіны дасягнулі высокага ўзроўню палітычнага ўзаемаразумення і даверу.

«Беларуска-кубінскае супрацоўніцтва грунтуецца на трывалым фундаменце традыцыйнай дружбы і павагі, а таксама на адзінстве поглядаў і адносін да сваёй нацыянальнай годнасці, незалежнасці, сацыяльнай справядлівасці і роўнасці», — гаворыцца ў віншаванні.

«Перакананы, што стратэгічнае партнёрства паміж Беларуссю і Кубай будзе і ў далейшым дынамічна развівацца», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## АЛЯКСАНДР ПАРАХАЎШЧЫКОЎ ПАКІНУЎ ЯРКІ СЛЕД У ГІСТОРЫІ САВЕЦКАЙ І РАСІЙСКАЙ КУЛЬТУРЫ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні ў сувязі са смерцю народнага артыста Расійскай Федэрацыі Аляксандра Парахаўшчыкова яго родным і калегам.**

«Аляксандр Парахаўшчыкоў пакінуў яркі след у гісторыі савецкай і расійскай культуры найперш як выдатны акцёр, які ўмеў ствараць уражальныя вобразы моцных і мужных людзей, сапраўдных мужчын, якія смела ідуць да сваёй мэты», — гаворыцца ў спачуванні.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі Аляксандра Парахаўшчыкова ведалі і высока цанілі за талент, моцны характар, адданасць мастацтву, і яго смерць болем адгукнулася ў сэрцах многіх беларусаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ВЯСНОВАЯ АБКАТКА



Юныя жыхаркі сталіцы адкрываюць новы вела-самакатны сезон.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі:**

*«Цяпер у нас атрымаліся значныя будаўнічыя перакосы: буйныя будаўнічыя трэсты прыйшлі на фермы, выконваюць работы на розных будаўнічых аб'ектах у аграрным сектары, а дробныя арганізацыі — СПМК, ПМК — засталіся ўбаку... Малыя будаўнічыя арганізацыі павінны быць задзейнічаны пры будаўніцтве жылля ў вёсцы, рэканструкцыях малочнатаварных ферм, работах па добраўпарадкаванні тэрыторый, у тым ліку ў гарадах».*

### Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.04.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8010,00 | ▼ |
| Еўра | 10430,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 269,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 998,47 | ▼ |

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 11° |
| Віцебск | + 9° |
| Гомель | + 13° |
| Гродна | + 10° |
| Магілёў | + 9° |
| Мінск | + 11° |

■ З першых вуснаў

Анатоль ТОЗІК, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі:

## «АД ПОЛАЦКА ПАЧАЛАСЯ БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ»

**Зараз ідзе актыўная падрыхтоўка да святкавання 1150-годдзя з часу заснавання Полацка. З гэтай нагоды рэдакцыя «Звязды» звярнулася з пытаннямі аб святкаванні слаўнай даты ў нашай краіне і на міжнародным узроўні да старшыні рэспубліканскага аргкамітэта па правядзенні юбілею Полацка, намесніка прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь А. Тозіка.**



Фота БЕЛТА.

**— Анатоль Апанасавіч, што для вас значыць юбілей Полацка?**

— У кожнай краіне ёсць месца, пабываўшы ў якім можна з упэўненасцю сцвярджаць: я дакрануўся да яе сэрца, я зразумеў яе душу. Не будзе перабольшваннем сказаць: душа Беларусі, яе сэрца тут, у старажытным Полацку, якому сёлета спаўняецца 1150 гадоў. Упершыню Полацк быў узгаданы ў старажытным усходнеславянскім летапісе «Аповесць мінулых гадоў» у 862 годзе. На працягу стагоддзяў горад стаяў і стаіць на скрыжаванні найважнейшых шляхоў, якія злучаюць Захад з Усходам, тут адбываліся значныя гістарычныя падзеі. Полацк згараў у полымі войнаў і паўставаў з попелу, нібы міфічная птушка Фенікс. Тут зараджалася, сцвярджалася і мацнела беларуская дзяржаўнасць, тут — выток Беларусі, першакрыніца нашай нацыянальнай культуры і самасвядомасці, нашай велічы і гонару за свой народ, сваю краіну.

У Беларусі няма іншага горада, які даў бы свету столькі выдатных асоб: святую заступніцу зямлі беларускай прападобную Еўфрасіннію Полацкую, першадрукара Францыска Скарыну, асветніка і публіцыста Сімяона Полацкага, вялікага князя Усяслава Брачыславіча... І да гэтага часу Полацк натхняе мастакоў і паэтаў, пісьменнікаў і музыкантаў.

Знакаміты вершаваны радок Рыгора Барадуліна «Ад Еўфрасінні, ад Скарыны, ад Полацка пачаўся свет...» — не перабольшванне. Менавіта тут пачыналася Беларусь. Усе вехі нацыянальнага развіцця прайшлі праз яго, пакінуўшы свой след.

Гэты горад — калыска нацыянальнай дзяржаўнасці, духоўнасці і культуры. Стагоддзямі намоленая полацкая зямля прываблівае шматлікіх паломнікаў, якія імкнуцца, дакрануўшыся да святыняў, атрымаць блаславенне. У палачан асаблівы менталітэт, у горада — асаблівая аўра. Захоўваючы гістарычную спадчыну, сучасны Полацк упэўнена крочыць у будучыню. Юбілей Полацка — гэта свята кожнага з нас паасобку і ўсіх жыхароў Беларусі разам!

**— Мы навучыліся прыгожа і ўрачыста адзначаць значныя падзеі ў жыцці беларускага народа. Але юбілей Полацка — асаблівая дата ў нашай гісторыі, якую і адзначыць хочацца па-асабліваму. Што аргкамітэт вылучыў у якасці прыярытэтаў пры распрацоўцы канцэпцыі мерапрыемстваў па святкаванні юбілею?**

— Святкаванне 1150-годдзя Полацка павінна стаць буйной нацыянальнай і міжнароднай культурнай, духоўнай і палітычнай падзеяй.

Канцэпцыя святкавання распрацавана з мэтай фарміравання комплексу найважнейшых юбілейных мерапрыемстваў, лейтматывам якіх з'яўляюцца тры асноўныя ідэі: Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці; Полацк — духоўна-асветніцкі і культурны цэнтр; Полацк сучасны еўрапейскі горад. СТАР. 2

■ Анонс

## КЛАСІКАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

**Газеты «Звязда», «Мінская праўда» і Мінскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі ў Год кнігі праводзяць літаратурную вандроўку «Шляхамі паэтаў».**

Творчая ініцыятыва прымеркавана да 130-годдзя Якуба Коласа і Янкі Купалы, 100-годдзя Максіма Танка. Журналісты і пісьменнікі сустрэнуцца з землякамі паэтаў, наведаюць памятныя мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю класікаў. А пасля раскажуць чытачам усёй краіны пра Мядзельскую, Маладзечанскую, Стаўбцоўскую старонкі, іншыя куточкі, што натхнялі на стварэнне неўміручых паэтычных твораў, што падаравалі пісьменнікам светлыя вобразы.

Заўтра, 18 красавіка, «дэсант» літаратурнай вандроўкі высадзіцца ў Мядзеле. У раённай бібліятэцы пройдзе «круглы стол» «Зямля, што нараджае паэтаў». Затым — сустрэча з вучнямі і настаўнікамі Сваткаўскай сярэдняй школы імя Максіма Танка і наведванне бацькоўскай сядзібы Максіма Танка.

Наступныя адрасы (а пра час сустрэч мы яшчэ нагадаем) — Яхімоўшчына, Маладзечна, Харужанцы на Лагойшчыне ды іншыя кропкі на літаратурна-краязнаўчай карце Міншчыны. Запрашаем і ўсіх вас, паважаныя чытачы, часцей зазіраць да святых мясцін Айчыны, часцей углядацца ў тую прастору, якая натхняла і выхоўвала таленты! Да сустрэч у купалаўскіх, коласаўскіх, танкаўскіх мясцінах!

## ДАДАТНАЕ САЛЬДА ЗНЕШНЯГА ГАНДЛЮ — 387 МЛН ДОЛАРАЎ

**За першыя два месяцы 2012 года Беларусь нагандлявала за мяжу на 387 млн долараў больш, чым закупіла, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт.**

Так, аб'ём знешняга гандлю таварамі за студзень-люты склаў 14,2338 млрд долараў, сярод якіх экспарт — 7,3104 млрд, імпарт — 6,9234 млрд. Дарэчы, летась у аналагічны перыяд гэты паказчык быў адмоўным — 1,8481 млрд долараў.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### БРЭЙВІК УЧЫНІЎ СКАНДАЛ У СУДЗЕ

Працэс па справе Брэйвіка пачаўся ўчора ў акруговым судзе Осла. Брэйвік прызнаў свае ўчынкі, аднак віны не прызнае. У пачатку красавіка злачынца заявіў, што яго ўчынак быў абумоўлены неабходнасцю самаабароны. На пачатку пасяджэння Брэйвік павітаў суд праваэкстрэмісцкім жэстам, выцягнуўшы правую руку, заціснутую ў кулак. Адразу пасля таго, як суддзя назваў удзельнікаў бакоў, Брэйвік атрымаў слова і заявіў, што «не прызнае нарвежскі суд». Да пачатку слуханняў Брэйвік падкрэсліў, што лічыць сябе «ваенным камандзірам», і таму яго справу павінен разглядаць ваенны трыбунал, а не звычайны суд. Таксама следчыя не знайшлі пацвярджэння існавання рыцарскага ордэна тампліераў, да якога прылічаў сябе нарвежскі тэрарыст. Сваё рашэнне па справе Брэйвіка суд мяркуе абвясціць да 22 ліпеня — першых угодкаў з дня трагедыі. У выпадку, калі суд прызнае ў тэрарыста наяўнасць свядомасці, яму пагражае 21 год турмы, суд пасля падоўжыць тэрмін зняволення. Калі ж Брэйвік будзе прызнаны вар'ятам, ён будзе адпраўлены на прымусовае лячэнне.

### У МАСКВЕ ТУСОЎШЧЫК ЗБІЎ ЧАТЫРОХ ЧАЛАВЕК

У Маскве іншамарка збіла чатырох. У машыне знаходзіўся малады чалавек, які сеў за руль пасля наведвання начнога клуба. «На стаянцы начнога клуба на Бярсенеўскай набярэжнай 19-гадовы масквіч, кіруючы аўтамабілем Infiniti FX-37, здзейсніў наезд на чатырох пешаходаў, а затым сутыкнуўся з прыпаркаванымі там машынамі», паведамілі ў паліцыі. Як высветлілася, здарэнне стала вынікам сваркі яшчэ ў клубе і на паркоўцы затрыманага з 18-гадовым хлопцам.

### ШВЕЦЫЯ ПАЗБЕГЛА ДЭФІЦЫТУ ТУАЛЕТНАЙ ПАПЕРЫ

Швецыі ўдалося пазбегнуць недахопу туалетнай паперы дзякуючы таму, што супрацоўнікі папяровых камбінатаў перадумалі ісці на забастоўку салідарнасці. Прафсаюзы дамовіліся з працадаўцамі літаральна за пяць з паловай гадзін да афіцыйнага аб'яўлення страйку. Масавая забастоўка ў Швецыі магла быць абвешчана з-за імкнення прафсаюзаў выраўнаваць зарплату рабочым на прамысловай вытворчасці і ў сферы паслуг. У выніку было прынята рашэнне, што павышэнне зарплаты ў сферы паслуг складзе 710 крон, а на складах — 665 крон.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ВАЛУЕЎ БАГАЦЕЙШЫ ЗА КАБЗОНА І КАБАЕВУ

**«Зорныя» дэпутаты Дзярждумы Расіі, як і ўсе астатнія, далі справаздачы пра свае даходы за 2011 год. Самым багатым з іх стаў баксёр-суперцяжкавагавік Мікалай Валуеў, які зарабіў больш за 23 мільёны рублёў.**



Пры гэтым ва ўласнасці ў яго значацца ўсяго два гаражы. Жонка баксёра, якая зарабіла крыху больш за 13 мільёнаў рублёў, валодае дзвюма кватэрамі і зямельным участкам у Расіі, дзвюма кватэрамі і жылым домам у Германіі і яшчэ адным домам у Іспаніі. У сумесным сямейным прыбытку «перамаглі» народны артыст Іосіф Кабзон з жонкай, якая зарабіла ў 2011 годзе амаль 40 мільёнаў рублёў. Гаспадар прынёс у бюджэт сям'і менш за 5 мільёнаў рублёў. Былая гімнастка Аліна Кабаева, якая была лідарам па прыбытках сярод дэпутатаў-славутасцяў у 2010 годзе (14,018 мільёна рублёў), летась зарабіла больш за 11,4 мільёна рублёў. «Зорка» моладзевых серыялаў актрыса Марыя Кажэўнікава прадставіла за 2011 год даход у памеры больш за 7,3 мільёна рублёў. Рэжысёр Станіслаў Гаварухін прадставіў у сваёй дэкларацыі даход у памеры больш за 2,6 мільёна рублёў.

### ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

18 красавіка 2012 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца пасяджэнне восьмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

### ПЯЦЬ БЕЛАРУСАЎ ЗАГІНУЛІ Ў ЛІПЕЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

У аўтамабільнай аварыі ў Ліпецкай вобласці Расіі 15 красавіка загінулі пяць грамадзян Беларусі, яшчэ трое паранены, паведамляе афіцыйны сайт Упраўлення па Ліпецкай вобласці МУС Расіі. Мікрааўтобус Volkswagen, у якім жыхары Сянно Віцебскай вобласці ехалі на работу ў Варонежскую вобласць, разбіўся на 392-м кіламетры трасы «Дон». Да моманту ДТЗ у дарозе беларусы знаходзіліся амаль 14 гадзін. Паводле адной з версій, вадзіцель заснуў за рулём, пасля чаго машына ўрэзалася ў грузавік, які стаяў на абочыне. Асобы загінулых устаноўленыя — гэта мужчыны 1976, 1982, 1984, 1986 і 1992 гадоў нараджэння.

## У КОЛЬКІ ГАДОЎ, ПА-ВАШАМУ, ТРЭБА ВЫХОДЗІЦЬ НА ПЕНСІЮ?



**Рустам СЕРАГЛАЗАЎ, намеснік дырэктара Цэнтра геафізічнага маніторынгу НАН Беларусі:**

— Мне праз паўгода 60. І я хацеў бы выйсці на пенсію, як толькі пройдуць гэтыя 6 месяцаў. Але гэта не значыць, што я не планую працаваць далей. Калі дазволіць здароўе, хутчэй за ўсё, застануся на працы. Хутка мы будзем праводзіць даследаванні на пляцоўцы, што адводзіцца пад будаўніцтва АЭС. І мне, вядома, хацелася б іх закончыць. Па-першае, у мяне рэдкая для Беларусі спецыяльнасць, і калі я пайду, трэба будзе шукаць іншага спецыяліста. Па-другое, у мяне яшчэ ёсць навуковыя інтарэсы, якія я спадзяюся рэалізаваць.



**Генадзь ГАРБУК, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР:**

— Я ўжо даўно на пенсіі, але працягваю працаваць. Тым не менш, лічу, што для мужчыны аптымальны ўзрост выхаду на пенсію — 60 гадоў. Гэта не значыць, вядома, што трэба тут жа спыняць усякую актыўнасць. Пакуль дазваляе здароўе — трэба працаваць. А пенсія — заробленыя даброты, якія павінны быць у чалавека з пэўнага ўзросту і якімі трэба карыстацца. Маё здароўе дазваляе мне вытрымліваць нагрузкі, яны для мяне звыклыя. Зусім нядаўна мы выпусцілі спектакль «Людзі на балоце» ў пастаноўцы А. Гарцуева. Я там іграю Чарнушку, бацьку Ганны. Мне прыемна было працаваць, з гэтым творам звязана многае ў маім жыцці. Зараз М. Пінігін робіць спектакль па казках Андэрсана, я там таксама заняты. Рэпетыцыі ідуць поўным ходам, і я проста не ўяўляю сябе без гэтага.



**Васіль ПРАДУН, мастацкі кіраўнік гарадскога канцэртнага аркестра г. Баранавічы:**

— Лічу, што для творчых людзей выходзіць на пенсію ў 60 ранавата. Усе мае настаўнікі — прафесары ў кансерваторыі, потым у аспірантуры — заканчвалі працаваць практычна перад самым сыходам з жыцця. Магчыма, для мужчыны, які працуе ў вытворчасці, 60 гадоў — гэта ўзрост. Але, упэўнены, гэта не ўзрост для таго, хто займаецца творчасцю, калі, безумоўна, ёсць здароўе і пэўны патэнцыял. Мне хутка 57. Але я думаю, што хопіць сіл яшчэ як мінімум на дзясятак гадоў. Яшчэ ёсць запал, шмат творчых планаў. Я мару, каб наш гарадскі аркестр быў на адным узроўні са сталічнымі аркестрамі. Чаму б і не?

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

## РАЎНАПРАЎНЫ ДЫЯЛОГ — ЗАМЕСТ ЭКАНАМІЧНЫХ САНКЦЫЙ

**З заклікам да пошуку разумнага кампрамісу звярнуўся да Еўрасаюза Прэзідыум Цэнтральнага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі.**

«Беларускі прафесійны саюз работнікаў адукацыі і навукі з'яўляецца адным з найбольш буйных і ўплывовых суб'ектаў грамадзянскай супольнасці і аб'ядноўвае ў сваіх радах больш як 600 тысяч работнікаў сістэмы адукацыі і студэнтаў. Прадстаўляючы інтэлектуальную эліту беларускага грамадства і студэнцтва краіны, мы глыбока занепакоеныя стаўленнем шэрагу еўрапейскіх структур да нашай краіны, — падкрэсліваецца ў распаўсюджаным звароце. — Беларусь заўсёды была ў цэнтры падзей, што адбываюцца на еўрапейскім кантыненце, падзяляла ўсе цяжкасці, якія выпадалі на долю народаў Еўропы. І наша краіна яўна не заслужыла такога «асаблівага становішча».

Ад дзейнасці прадпрыемстваў, якія церпяць ад эканамічных санкцый, залежыць дабрабыт не толькі іх работнікаў, акцыянераў, але і эканомікі краіны. Гэтыя прадпрыемствы прадстаўляюць перш за ўсё недзяржаўны сектар, але, дзякуючы свайму экспартнаму патэнцыялу, аказваюць значны ўплыў на фарміраванне бюджэту краіны. Эканамічныя санкцыі будуць скіраваны супраць беларускага народа. Ад іх пацерпяць радавыя работнікі, іх сем'і, а таксама сферы, якія фінансуюцца з бюджэту, у тым ліку і адукацыя. Мы звяртаемся да Еўрапейскага саюза з заклікам да пошуку разумнага кампрамісу, рашэнняў, прымальных для ўсіх бакоў. Няма супярэчнасцяў, якія нельга ўрэгуляваць на мове дыпламатыі. Усіх, ад каго залежыць вырашэнне гэтага пытання, заклікаем устрымацца ад стратэгіі санкцый, а таксама вярнуцца да раўнапраўнага дыялогу. Заклікаем палітыкаў адмовіцца ад заклікаў да эканамічнага ціску на Рэспубліку Беларусь. Няма палітычных мэтаў, якімі б былі апраўданы рашэнні, што нясуць сацыяльна-эканамічную пагрозу...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## УНАЧЫ НА СЕРАДУ ЗАМАРАЗКІ ДА МІНУС 2

**У аўторак цыклон, які гаспадарыў у нас гэтымі днямі, адыдзе далей, у бок Ленінградскай вобласці Расіі, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

Заўтра чакаецца малавоблачна і пераважна без ападкаў, толькі ўначы месцамі па Гомельскай вобласці кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы на сераду пахаладае да мінус 2 — плюс 4 градусаў, па паўднёвым усходзе — да плюс 7 градусаў. Удзень — 8—14 цяпла. А вось у чацвер на тэрыторыю Беларусі пачне распаўсюджвацца вільготнае паветра з боку Чорнага мора. Таму ўначы на чацвер на поўдні Беларусі, а ўдзень і ў цэнтральных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Тэмпература ўначы ад мінус 1 па поўначы да плюс 6 градусаў на поўдні Беларусі. Удзень будзе 10—17, па ўсходзе краіны — да 20 цяпла. Дажджліва будзе і ў пятніцу, месцамі дажджы моцныя, у асобных раёнах сур'ёзныя навальніцы. Тэмпература удзень — плюс 10—17, на ўсходзе да 19 градусаў вышэй за нуль.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ПАВЫШАНЫ ЗАКУПАЧНЫЯ ЦЭНЫ

**Пастановай Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання ад 3 красавіка 2012 года № 20 устаноўлены фіксаваныя цэны на прадукцыю раслінаводства ўраджаю 2012 года, пастановай № 21 — фіксаваныя цэны на прадукцыю жывёлагадоўлі, што закупляецца для дзяржаўных патрэб.**

Раней у рэспубліцы дзейнічалі гранічныя мінімальныя закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю, якая закупляецца для дзяржаўных патрэб. Фактычны ўзровень прымяняемых у абласцях свабодных закупачных цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю быў значна вышэйшы за мінімальныя і адрозніваўся ў залежнасці ад рэгіёна. Згодна з пастановай Мінсельгасхарча № 20, закупачныя цэны на збожжавыя і шэраг крупяных культур ураджаю 2012 года павялічваюцца ў сярэднім на 65 працэнтаў. Цэны на піваварны ячмень узрастуць у 2,9 раза, цукровыя буракі — у 2,5 раза, алейнае семя рапсу — у 3,1 раза, грэчку — у 2,1 раза. Закупачныя цэны на пастаўлены ў лік дзяржзаказу піваварны ячмень складуць Br1,6 млн супраць Br550 тыс. у 2011 годзе. Закупачныя цэны на кандыцыйныя буракі павялічацца са Br140 тыс. да Br350 тыс., на алейнае семя рапсу — з Br1 млн да Br3,1 млн, грэчкі — з Br1,726 млн. да Br3,685 млн. У1,7-2 разы павышаюцца закупачныя цэны на каровіна малако, буйную рагатую жывёлу (БРЖ) і мяса буйной рагатай жывёлы, свіней і свініну, што рэалізуюцца для дзяржаўных патрэб. Закупачныя цэны на малако ўзрастуць у 1,7 раза. Новая цана на малако гатунку «экстра» складзе Br3,215 млн за тону, вышэйшага гатунку — Br2,77 млн, першага гатунку — Br2,555 млн. Закупачныя цэны на свіней вырастуць амаль у 2 разы. Цана на свіней для забою складзе ў залежнасці ад катэгорыі ад Br8,943 млн да Br18,969 млн за тону жывой вагі, на свініну за тону забойнай вагі — ад Br17,072 млн да Br31,671 млн. Амаль у 2 разы павышаюцца закупачныя цэны на буйную рагатую жывёлу. Цэны на БРЖ для забою складуць ад Br5,418 млн да Br64,974 млн за тону жывой вагі, за тону забойнага вагі — ад Br13,984 млн да Br121,135 млн. Абедзве пастановы ўступяць у сілу пасля іх афіцыйнага апублікавання.

# «АД ПОЛАЦКА ПАЧАЛАСЯ БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Рэспубліканскім аргкамітэтам зацверджана праграма асноўных культурных мерапрыемстваў святкавання 1150-годдзя Полацка «Гімн Полацку — бацьку гарадоў беларускіх». У праграму святкавання ўключана шмат мерапрыемстваў — культурных, духоўных, спартыўных. Яркімі падзеямі абяцаюць стаць канцэрт «Шэдэўры сусветнага мастацтва каля сцен старажытнай Сафіі», гістарычны спектакль «Рагнеда» Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь тэатра «Пілігрым» з удзелам артыстаў тэатра імя Якуба Коласа, дзіцячы мастацкі пленэр. Адбудзецца ўрачыстае адкрыццё помніка дойліду Іаану, на тэрыторыі ўніверсітэцкага дворыка будзе закладзена капсула з пасланнем студэнтам будучага.

Пад эгідай Праваслаўнай царквы ў горадзе будзе арганізавана свята праваслаўнай творчасці «Полацк збірае землякоў», у межах якога пройдуць свята калакольнага звону, канцэрт духоўнай музыкі і песнапенняў, праваслаўны кірмаш «Пасхальная радасць», хрэсны ход і сумеснае богаслужэнне царкоўных іерархаў, прысвечаныя Дню памяці прападобнай Еўфрасінні Полацкай.

**— Дастойнае ўшанаванне слаўнага мінулага патрабуе адпаведнага грунтоўнага яго асэнсавання гісторыкамі і даследчыкамі. Якія прапановы ўжо паступілі ад айчынных навукоўцаў?**

— Мяркуецца правядзенне дзвюх навуковых канферэнцый (у маі, калі будуць праходзіць асноўныя святкаванні, і ў лістападзе — пры падвядзенні вынікаў юбілейнага года). У міжнароднай навуковай канферэнцыі «Полацк у гісторыі і культуры Еўропы» 22 — 25 мая прымуць удзел гісторыкі і культуролагі з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Швецыі.

Шмат мерапрыемстваў запланавана Полацкім дзяржаўным універсітэтам: міжнародны навукова-практычны семінар «Слова — тэкст — кантэкст. Метады, спосабы і прыёмы аналізу мастацкага твора і літаратурнага працэсу», у рамках якога будуць прадстаўлены даклады, прысвечаныя адукацыйнай і літаратурнай дзейнасці полацкіх езуітаў; рэспубліканская выстава работ студэнтаў, якія вучацца па спецыяльнасці «Архітэктура», на тэму «Арганізацыя турыстычнай прасторы Полацка».

Выдавецтвам «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі» запланавана выданне кнігі, прысвечанай гісторыі Полацка, аўтарамі якой з'яўляюцца вядучыя навукоўцы-гісторыкі Беларусі. У ёй будуць прадстаўлены апошнія звесткі аб адкрыццях па гісторыі горада.

**— Цяпер, калі ласка, некалькі слоў аб святкаванні на міжнародным узроўні. Як вядома, ЮНЕСКА ўключыла юбілей беларускага горада ў каляндар памятных дат 2012—2013 гадоў. Што мяркуецца зрабіць, каб пра Полацк і Беларусь даведалася як мага больш людзей у свеце?**

— Юбілей Полацка мае міжнароднае значэнне. Сапраўды, ЮНЕСКА ўключыла 1150-годдзе Полацка ў каляндар памятных дат 2012—2013 гадоў. У штаб-кватэры гэтай арганізацыі ў Парыжы ў кастрычніку 2012 года адкрыецца тэматычная выстава. Сёння вядзецца падрыхтоўка да экспазіцыі фотаздымкаў, якія распавядаюць пра мінулае і сучаснасць горада. Упершыню пры падтрымцы ЮНЕСКА ў Полацку пройдзе міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі».

**— Юбілей — гэта і рэтраспектыўны позірк у далёкае мінулае, і нагода падумаць пра тое, што можна зрабіць для развіцця старажытнай сталіцы Беларусі, каб Полацк ператварыўся ў міжнародны гісторыка-культурны і навукова-асветніцкі цэнтр. Якія ёсць меркаванні, планы на гэты конт?**

— Юбілей Полацка — значная падзея ў жыцці краіны, якая павінна мець міжнародны рэзананс. Паколькі Полацк з'яўляецца культурным і духоўным цэнтрам, рыхтуюцца не толькі свецкія, але і царкоўныя мерапрыемствы. З нагоды юбілею ў Полацк вернецца папулярны фестываль сярэднявечнай культуры «Рубон». Папярэднія фестывалі паказалі, наколькі арганічна выглядаюць гістарычныя касцюмы, як ажывае гісторыя на зямлі, дзе кожны крок адгукаецца рэхам слаўных падзей. Таксама жыхароў і гасцей горада чакаюць інтэрактыўны фестываль музейных калекцый і многае іншае.

У юбілейныя дні ў горадзе над Дзвіной адбудзецца міжнародная праваслаўная канферэнцыя з удзелам прадстаўнікоў гарадоў трох Святых Сафій — Ноўгарада, Кіева і Полацка.

Майстрыхі народнага клуба лапікавага шыцця «Рошва» Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур рыхтуюць свой падарунак гораду — «Полацкі абярэг». Гэты міжнародны праект стартаваў 5 гадоў таму, напярэдадні 1145-годдзя Полацка. За гэты час больш за 370 майстроў з чатырнаццаці краін свету — у тым ліку з Аргенціны, Германіі, Японіі, Даніі, Іспаніі, Расіі, Казахстана, Малдовы — даслалі ў Полацк свае працы, у якія ўклалі не толькі цеплыню майстравітых рук, але і часцінкі душы, адрасаваўшы гораду найлепшыя пажаданні. Полацкія майстрыхі сшылі іх у адзінае палатно. Зараз «Полацкі абярэг» — сапраўдны рукатворны шэдэўр: ён мае плошчу 99 квадратных метраў. Гэтае ўнікальнае палатно прасякнутае энергетыкай павагі і любові да старажытнага горада і яго жыхароў.

Падобныя святы — не проста даніна традыцыі, яны істотна павялічваюць прыток турыстаў, узнімаюць прэстыж краіны. Старажытны Полацк — выдатнае месца, каб пачаць з яго знаёмства з Беларуссю.

Юбілей можа стаць штуршком да планамернага (напрыклад, археалагічнага) вывучэння Полацка. У сувязі з гэтым у Полацку трэба было б размясціць навуковы цэнтр па вывучэнні полацкай археалогіі і гісторыі ці стацыянарную археалагічную экспедыцыю. Тым больш што плануецца актыўнае будаўніцтва з мэтай развіцця гістарычных раёнаў горада. Мы спадзяёмся, што інвестыцыйны форум, які пройдзе ў горадзе ў святочныя дні, прыцягне ўвагу зацікаўленых асоб да развіцця Полацка.

**— Сёння адносіны афіцыйнага Мінска з Еўрапейскім саюзам цяжка назваць канструктыўнымі. Хочацца спадзявацца, што іх нармалізацыя некалі пачнецца. І магчыма, з актывізацыі культурных стасункаў. Нядаўна ў Бруселі аб'явілі аб пачатку рэалізацыі 15 рэгіянальных праектаў пры фінансавай падтрымцы ЕС у сферы культуры ў краінах праграмы «Усходняе партнёрства», у тым ліку і ў Беларусі. Ці былі прапановы ад кіраўніцтва праграмы нейкім чынам далучыцца да святкавання юбілею Полацка як падзеі агульнаеўрапейскага значэння?**

— Прапановы па далучэнні да святкавання юбілею Полацка ад кіраўніцтва праграмы «Усходняе партнёрства», на жаль, не паступалі, але мы гатовы разгледзець іх, калі яны паступяць.

**— Зразумела, галоўныя падзеі падчас юбілею адбудуцца ў самім Полацку. А якое свята без яркіх і запамінальных імпрэз, сустрэч з мастацтвам у розных яго праявах? Калі будзе дадзены афіцыйны старт святам у горадзе? Як і з чаго яны пачнуцца? Чым абяцае парадаваць, а магчыма, і здзівіць палачан і гасцей горада святочная праграма?**

— Урачыстыя мерапрыемствы стартуюць 25 мая і працягнуцца да 5 чэрвеня — Дня памяці прападобнай Еўфрасінні Полацкай. Прэамбулай свята стане міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, арганізаваная Нацыянальнай акадэміяй навук і Полацкім дзяржаўным універсітэтам. Увечары 25 мая адбудзецца канцэрт «Шэдэўры сусветнага мастацтва каля сцен старажытнай Сафіі», дзе сваё мастацтва прадэманструюць артысты Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.

Урачыстае адкрыццё свята — 26 мая на плошчы Свабоды. На галоўнай сцэнічнай пляцоўцы пройдзе ўшанаванне лепшых працаўнікоў. Па традыцыі, будуць абвешчаны імёны палачан, удастоеных звання «Ганаровы грамадзянін Полацка», адбудзецца канцэрт, падчас якога выступяць вядомыя айчынныя выканаўцы з праграмай «Залатая калекцыя беларускай песні».

Кожны з удзельнікаў і гасцей свята зможа знайсці для сябе нешта цікавае: падчас урачыстасцяў у горадзе будуць працаваць дзіцячая, моладзевая, літаратурная, фальклорная і іншыя тэматычныя пляцоўкі, выстава-продаж вырабаў рамеснікаў «Крывіцкі кірмаш».

У Дзень памяці прападобнай Еўфрасінні Полацкай, 5 чэрвеня, эпіцэнтр урачыстасцяў перамесціцца ў Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр.

**— Дарэчы, каго з гасцей чакаюць у Полацку на юбілей?**

— Прапановы па запрашэнні прадстаўнікоў дыпламатычнага корпусу, замежных гасцей накіраваны ў Міністэрства замежных спраў. Спадзяёмся, што яны прымуць запрашэнні і пабываюць у Полацку ў святочныя дні. У складзе дэлегацый гарадоў-пабрацімаў, якіх у Полацка 18, горад наведаюць не толькі афіцыйныя асобы, але і творчыя калектывы, народныя майстры і ўмельцы, якія прадэманструюць сваё майстэрства на традыцыйным кірмашы рамёстваў і сцэнічных пляцоўках.

Чакаецца, што ў дні святкавання юбілею горад наведаюць некалькі тысяч гасцей. Полацк гасцінна запрашае ўсіх дакрануцца да гісторыі і сучаснасці горада і стаць удзельнікамі юбілейных урачыстасцяў!

**Пытанні задаваў Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

## З БЕЛАРУСІ НА КУБУ МОЖНА ДАЕХАЦЬ НА ТРАКТАРЫ

**20 гадоў таму былі ўсталяваны дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і Кубай. З гэтай нагоды ўчора адбылася сустрэча рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Рэспублікі Куба і Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД і Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Куба ў Рэспубліцы Беларусь Альфрэда Ньевес Партуонда.**

— У будучыні нашы адносіны, на мой погляд, будуць толькі ўмацоўвацца, — заявіў журналістам кубінскі пасол. — Я ўпэўнены ў гэтым, таму што нашы адносіны базуюцца на моцным сяброўстве. Гэтыя адносіны вытрывалі выпрабаванні дзесяцігоддзямі і заўсёды суправаджаліся шчырай павагай паміж нашымі народамі і дзяржавамі, заставаліся сяброўскімі, развіваліся і ўмацоўваліся. Народы Кубы і Беларусі вельмі падобныя адзін да аднаго. Куба, па сутнасці, з'яўляецца «ключом» да Амерыкі, а Беларусь — мастом паміж Заходняй і Усходняй Еўропай. У Беларусі маюць павагу да ўсіх веравызнанняў, нацыянальнасцяў. Тое ж самае і на Кубе. Мы сёння святкуем сяброўства паміж нашымі краінамі. Калі казаць пра нашы гандлёвыя адносінах, то я павінен адзначыць, што будучыня і ў гэтых адносінах уяўляецца выдатнай. Напрыклад, беларускія трактары з'явіліся ў нашай краіне яшчэ ў 1961 годзе. І цяпер МТЗ пастаўляе шмат трактароў на Кубу. Аднак мы супрацоўнічаем і ў галінах нанатэхналогій, вытворчасці харчовых прадуктаў, арганізацыі рамонту і аднаўлення беларускай тэхнікі, якой на Кубе вельмі шмат. Безумоўна, нашы гандлёвыя адносіны вызначаюцца і прагматызмам, але ў цэлым яны заснаваны на сяброўстве і супрацоўніцтве.

Акрамя таго, пасол выказаўся наконт паставак на Кубу беларускіх аўтобусаў: «Мы вельмі задаволены пастаўкай сотні аўтобусаў МАЗ. За кошт гэтай закупкі мы палепшылі транспартны стан Гаваны. Але на будучыню мы маем вялікія планы па развіцці транспартнай сістэмы Кубы, і Беларусь пасля такога вопыту мае пэўныя перавагі ў далейшым. І трэба адзначыць, што кубінскія людзі ўжо даўно знаёмыя з якасцю беларускай прадукцыі, гэта тычыцца не толькі паставак аўтобусаў і трактароў, але і шмат якіх іншых прадуктаў».

Пасол Кубы выказаўся таксама пра магчымыя эканамічныя санкцыі супраць Беларусі як пра недапушчальны крок заходніх палітыкаў. У сваю чаргу Ігар Карпенка, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Рэспублікі Куба запэўніў, што і Беларусь таксама заўсёды будзе выступаць супраць эканамічнай блакады Кубы з боку ЗША.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## АБЗАЦ

◢ Больш як 70 зваротаў ад грамадзян паступіла на прамую лінію Камітэта дзяржаўнага кантролю па пытаннях якасці атрымання медыцынскіх паслуг у паліклініках краіны. Найбольш пытанняў датычылася забеспячэння паліклінік профільнымі спецыялістамі і правільнасці ўстанаўлення дыягназаў.

◢ **Новыя могілкі плануецца пабудаваць у наваколлі Мінска паблізу вёскі Казекава (Мінскі раён). Як паведаміў генеральны дырэктар камунальнай гаспадаркі Мінгарвыканкама Эдуард Зотаў учора на аператыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме на гэтыя мэты выдзелены ўчастак плошчай 83 га. У 2012 годзе завершыцца праектаванне першай чаргі могілак, на 2013 год запланаваны пачатак будаўніцтва. Пабудаваць могілкі намечана за два гады.**

◢ 14 красавіка прыкладна ў 23.48 на станцыі метро «Уручча» па неасцярожнасці на рэйкі ўпаў 30-гадовы жыхар пасёлка Бараўляны Мінскага раёна, які быў у стане алкагольнага ап'янення. З закрытай чэрапна-мазгавой траўмай ён шпіталізаваны ў Мінскую абласную клінічную бальніцу.

◢ **У Лідскім раёне сутыкнуліся 2 легкавыя машыны — Toyota Land Cruiser і Opel Astra. Загінуў пасажыр Opel Astra, яшчэ 6 чалавек пацярпелі. Па інфармацыі МУС, у сутыкненні вінаваты кіроўца Toyota. Абставіны высвятляюцца.**

## ПОЎНЫ АБЗАЦ



◢ Кітайская мастачка склала 12-метровую карціну з шалупіння семак сланечніка. На выраб карціны Лу Баўчы з Пекіна патраціла два гады. Выніковы 12-метровы шэдэўр — паменшаная копія старажытнай кітайскай фрэскі. З шалупіння кітаянка выклала больш за 900 персанажаў і сотні дрэў. Яна сцвярджае, што шалупіннем маляваць намнога цяжэй, чым фарбамі. Шмат часу ідзе на тое, каб правільна падабраць памер і колер шалупіння. Такія карціны Лу Баўчы складае ўжо 20 гадоў. На яе творы існуе вялікі попыт.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

■ Прафсаюзы

Марцін РОМЕР:

# «АДУКАЦЫЯ — ІНСТРУМЕНТ, ЯКІ ДАПАМОЖА ЕЎРОПЕ ПЕРААДОЛЕЦЬ НАСТУПСТВЫ ЭКАНАМІЧНАГА КРЫЗІСУ»

**«Эканоміць і скарачаць выдаткі на фінансаванне адукацыйнай галіны недапушчальна нават ва ўмовах эканамічнага крызісу, бо такія захады могуць у будучыні пацягнуць за сабой сацыяльныя ўзрушэнні», — такую думку выказаў кіраўнік Еўрапейскага камітэта прафсаюзаў адукацыі спадар Марцін РОМЕР, які нядаўна наведаў Мінск і сустрэўся са сваімі калегамі з Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Для даведкі: Еўрапейскі камітэт прафсаюзаў адукацыі з'яўляецца рэгіянальнай структурай Інтэрнацыянала Адукацыі (глабальнай федэрацыі прафсаюзаў настаўнікаў і работнікаў сістэмы адукацыі) і прадстаўляе на дадзены момант інтарэсы 135 прафесійных саюзаў настаўнікаў з 45 еўрапейскіх краін. Усяго ён аб'ядноўвае ў Еўропе 12,8 мільёна педагогаў: работнікаў дашкольнай, агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай, прафесійнай і вышэйшай адукацыі. Журналіст «Звязды» скарыстаўся выпадкам, каб задаць Марціну Ромеру некалькі пытанняў:**

***— Спадар Ромер, для Беларусі, на жаль, вельмі актуальнай стала ў апошнія гады праблема зніжэння прэстыжу прафесіі педагога ў грамадстве. Менавіта па гэтай прычыне прыцягнуць матываваных маладых людзей на педагагічныя спецыяльнасці становіцца ўсё больш праблематычным. І сёння ў нас актыўна абмяркоўваецца неабходнасць увядзення падчас прыёмнай кампаніі прафесійна-псіхалагічнай гутаркі для будучых педагогаў, каб адразу адсейваць выпадковых людзей. Пагадзіцеся, што памылка з выбарам педагагічнай прафесіі можа вельмі дорага каштаваць усяму грамадству, а не толькі канкрэтнаму маладому чалавеку...***

— Мушу канстатаваць, што падзенне прэстыжу прафесіі педагога назіраецца ў вельмі многіх еўрапейскіх краінах, а таксама ў Аўстраліі, Канадзе і ЗША. Педагогі амаль паўсюдна скардзяцца на тое, што не адчуваюць паважлівага стаўлення да сябе як з боку навучэнцаў, так і з боку іх бацькоў. Ніхто капялюш перад настаўнікам сёння не знімае. Літаральна днямі ў Вільнюсе праходзіў семінар, удзельнікі якога спрабавалі знайсці адказ на пытанне, як утрымаць прафесіяналаў у педагагічнай прафесіі? Асабіста я лічу, што гэта дастаткова складаная праблема звязана як з незадаволенасцю ўзроўнем заробкаў у адукацыйнай галіне, так і са спецыфікай працы педагогаў і вялікай адказнасцю, якая кладзецца на іх плечы. Калі вы не можаце прапанаваць годную заработную плату, то вельмі складана запрашаць на работу прафесіяналаў.

З іншага боку, і кола абавязкаў у педагогаў сёння істотна пашырылася ў параўнанні, скажам, з тым, што было яшчэ 30-40 гадоў таму. Педагог ужо не можа быць проста носьбітам інфармацыі, не можа толькі трансляваць вучням гэтую інфармацыю. Трэба навучыць сваіх вучняў самастойна шукаць патрэбныя веды. Тым больш што крыніц інфармацыі сёння больш чым дастаткова і яны ўсім даступныя. Сучасны педагог павінен быць сучасным і мабільным, як сённяшнія дзеці. Агульная эрудыцыя і жаданне змяняцца заўсёды высока цэняцца вучнямі.

Магу прывесці прыклад Даніі — краіны, дзе я жыву. Сёння большасць навучэнцаў у нас аб'яднаны ў групы: яны разам займаюцца, скажам, пошукам інфармацыі ў інтэрнэце. А педагог толькі іх курыруе і накіроўвае пошукі ў патрэбнае рэчышча. Яго задача пракантраляваць, як навучэнцы ўзаемадзейнічаюць у камандзе, як яны разам знаходзяць вырашэнне тых ці іншых праблем, паколькі ўменне працаваць у камандзе мае выключнае значэнне для вядзення бізнэсу як на лакальным, так і на міжнародным узроўні. Педагогі павінны спрыяць сацыяльнай мабільнасці сваіх выхаванцаў. Павінны вучыць дзяцей прымаць самастойныя рашэнні і несці за іх адказнасць.



Сустрэча Марціна Ромера *(другі злева)* са старшынёй ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандрам Бойкам.

Натуральна, што далёка не кожны ахвотны можа быць педагогам. Фінляндыя — адна з нешматлікіх еўрапейскіх краін, дзе моладзь ахвотна ідзе ў педагогіку. Але пры адборы будучых спецыялістаў там звяртаюць увагу не толькі на акадэмічную паспяховасць прэтэндэнтаў, але і на іх маральна-псіхалагічныя якасці, без якіх педагог не можа адбыцца. Перад прыняццем ва ўніверсітэт усе будучыя педагогі праходзяць спецыяльнае інтэрв'ю, падчас якога выкладчыкі спрабуюць высветліць, як чалавек будзе весці сябе ў той ці іншай сітуацыі, як ён будзе рэагаваць на магчымую крытыку з боку навучэнцаў ці іх бацькоў, як будзе паводзіць сябе з так званымі «цяжкімі» вучнямі.

***— У Беларусі педагогіка мае «жаночы твар». А ў школах колькасць педагогаў-мужчын і ўвогуле не перавышае 13 працэнтаў...***

— Сітуацыя, у прынцыпе, тыповая для ўсіх еўрапейскіх краін. Хоць яшчэ 25-30 гадоў таму колькасць педагогаў-мужчын і педагогаў-жанчын была прыкладна пяцьдзясят на пяцьдзясят. Сёння ж педагогі-мужчыны складаюць у лепшым выпадку 20 працэнтаў ад агульнай колькасці. А, напрыклад, у Балгарыі і ўвогуле вельмі цяжка будзе знайсці педагога-мужчыну. Гэта таксама адно з наступстваў зніжэння прэстыжу ў грамадстве прафесіі педагога. Калі не прапанаваць мужчыне добрую зарплату, то ён будзе шукаць спосабы для сваёй самарэалізацыі ў іншым месцы. Дарэчы, у Фінляндыі, дзе прафесія настаўніка лічыцца адной з самых паважаных і запатрабаваных, прадстаўніцтва мужчын складае 40-50 працэнтаў ад агульнай колькасці педагогаў.

***— А ці актуальная для еўрапейскіх краін праблема зніжэння якасці школьнай адукацыі? Выкладчыкі беларускіх ВНУ ўсё часцей выказваюць незадаволенасць якасцю падрыхтоўкі маладых людзей, якія прыходзяць атрымліваць вышэйшую адукацыю...***

— Няхай ніхто на мяне не пакрыўдзіцца, але выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў паўсюдна і ва ўсе часы былі не задаволены якасцю ведаў сваіх студэнтаў. Так было і падчас майго навучання. Што тычыцца якасці адукацыі, то ў Еўропе пытанне ставіцца крыху інакш. Мы не разглядаем праблему зніжэння якасці адукацыі. Стаіць задача павышэння якасці адукацыі, паколькі на еўрапейскай прасторы назіраецца даволі жорсткая канкурэнцыя ў адукацыйнай сферы. І мы з нашымі партнёрамі праводзім мноства мерапрыемстваў у розных сферах, скіраваных на павышэнне якасці адукацыі.

Увогуле хачу падкрэсліць, што для павышэння якасці адукацыі неабходна выкананне некалькіх умоў: з аднаго боку, трэба каб дзяржава была пазітыўна настроена на паляпшэнне якасці адукацыі, а з іншага боку, дзяржава павінна знаходзіцца ў партнёрскім дыялогу з прафсаюзнымі арганізацыямі. Толькі ў выпадку наладжвання плённага дыялогу паміж дзяржавай і прафесійнымі саюзамі можна спадзявацца на пазітыўныя зрухі.

Фінансавы крызіс у Еўропе, на жаль, найбольш моцна ўдарыў менавіта па адукацыйнай галіне. У найбольшай ступені ад наступстваў фінансавага крызісу пацярпелі педагогі краін Паўднёвай, некаторых краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. У Партугаліі, Іспаніі, Грэцыі назіраецца вельмі высокі ўзровень беспрацоўя сярод моладзі. Зараз мы працуем над тым, каб зрабіць усё магчымае для захавання на ранейшым узроўні дзяржаўных выдаткаў на сістэму адукацыі. На шчасце, нам удалося пераканаць членаў Еўрапейскай камісіі ў тым, што адукацыя з'яўляецца якраз тым інструментам, які дапаможа Еўропе пераадолець наступствы эканамічнага крызісу.

**Надзея НІКАЛАЕВА** ■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## У ВОЗЕРА ЎПАЎ... ПАРАПЛАН

**Бліжэй да вечара параплан, які ляцеў нізка над возерам Мацярынскім у Пухавіцкім раёне, страціў кіраванне і ўпаў у ваду.**



— Парапланерыст з усім рыштункам, які важыць не менш за 60 кілаграмаў, аказаўся ў халоднай вадзе. Глыбіня возера ў месцы падзення была тры метры. Мужчына цудам вызваліўся ад рухавіка, набраўшы поўныя лёгкія вады. Ён паспрабаваў самастойна даплыць да берага, дзе былі людзі, якія ўжо выклікалі выратавальнікаў, — распавёў падрабязнасці здарэння старшы інспектар Цэнтра даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег Малевіч. — Работнікі МНС аператыўна дасталі мужчыну і ўвесь яго рыштунак з вады спачатку ў лодку, а потым даставілі на бераг. Парапланерыст настолькі замёрз, што не адчуваў свайго цела. Выратавальнікі расцерлі пацярпелага, ухуталі ў сухое цёплае адзенне, выклікалі медыкаў. Ад шпіталізацыі мужчына адмовіўся. Тады выратавальнікі забралі яго з сабой у дзяжурную часць, дзе парапланерыст змог прыняць кантрасны душ. Потым яго напаілі гарачай гарбатай, далі лекі і паклалі ў ложак, дзе ён і дачакаўся сваіх родных. Чалавек не пацярпеў, нічога не здарылася і з яго лятальным рыштункам. Удзячныя родныя забралі мужчыну дадому.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## НЕЛЕГАЛАМ НЕ ПРАЙСЦІ

**Органамі памежнай службы Беларусі затрыманы грамадзянін Расіі чачэнскай нацыянальнасці, які спрабаваў нелегальна перайсці мяжу на тэрыторыю Літвы.**

Як паведамляе прэс-служба УКДБ Рэспублікі Беларусь па Гродзенскай вобласці, грамадзянін спрабаваў адпрацаваць маршрут нелегальнай перапраўкі ў Літву 30-ці нелегалаў з краін азіяцкага рэгіёна. Апошнія чакалі перапраўкі ў адным з райцэнтраў Гродзенскай вобласці на канспіратыўнай кватэры. Затрыманы і раней нелегальна пражываў у розных краінах Еўропы, аднак са Швейцарыі быў дэпартаваны ў Расію.

Толькі летась супрацоўнікамі УКДБ па Гродзенскай вобласці сумесна з пагранслужбай спынена дзейнасць трох злачынных груп, якія займаліся нелегальнай транспарціроўкай мігрантаў у Заходнюю Еўропу. «Мігрантамі» аказваліся ў тым ліку выхадцы з Афганістана, Турцыі і Чачні, больш за палову з іх знаходзіліся на ўліку рызык-прагнозаў тэрарыстычнай накіраванасці.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## АРСЕНАЛ ДЛЯ ХАТНЯГА КАРЫСТАННЯ?

Кіраўнік аднаго з філіялаў ААТ «Гомельрэмбуд» захоўваў у сябе дома цэлы склад зброі. У прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама паведамілі: у гамяльчаніна канфіскаваны рэвальвер сістэмы «Наган», пісталет сістэмы «Марголіна», 1266 патронаў рознага калібру, тратылавая шашка маркі 200, бяздымны нітрацэлюлозны паляўнічы порах, а таксама 3 шнуры, для дэтанацыі маркі «ДШ-У».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Энергетыка будучыні

# НАВАГРУДСКІ «ГІГАНТ»

## За 10 месяцаў ім выпрацавана столькі электраэнергіі, колькі разлічвалі атрымаць за год

**Днямі адзіная (пакуль) ветраэнергетычная ўстаноўка (ВЭУ) на пляцоўцы каля хутара Грабнікі побач з Навагрудкам «адзначае» свой першы юбілей — год з моманту ўводу ў эксплуатацыю. Журналісты «Звязды» пацікавіліся вынікамі яе працы і перспектывамі на будучыню.**

**✓ Лідарамі па выкарыстанні энергіі ветру традыцыйна з'яўляюцца Германія, Іспанія, ЗША, Індыя і Данія. Па выніках 2010 года на першым месцы па сумарнай колькасці ўстаноўленых магутнасцяў ветраных электрастанцый упершыню аказаўся Кітай.**

**✓ У Беларусі да 2011 года ўжо меўся пэўны вопыт у гэтай сферы (два ветрагенератары магутнасцю 250 і 600 кВт устаноўлены на беразе возера Нарач), які пацвярджае, што ў нашай краіне пры ўмове правільнага выбару пляцоўкі для размяшчэння ўстаноўкі можна забяспечыць выпрацоўку энергіі ветру.**

**✓ Першая ў Беларусі прамысловая ветраэнергетычная ўстаноўка магутнасцю 1,5 МВт, якая летась уведзена ў эксплуатацыю ў Навагрудскім раёне, выраблена кітайскай кампаніяй «HEAG».**

Што ўяўляе сабой вятрак? Першае ўражанне — гігант, сапраўдны «гаспадар» наваколля. Праўда, ацаніць яго параметры «на вока» нават зблізку даволі складана. Энергетыкі канкрэтызавалі, што вышыня ўстаноўкі — 82 метры, а важыць яна 208 тон. Вятрак устаноўлены на фундаментнай апоры ў выглядзе васьмігранніка дыяметрам 14 метраў. Маса фундамента — 1000 тон. Устаноўка мае тры лопасці даўжынёй 42 метры кожная.

Калі мы разам з **начальнікам Навагрудскага РЭС Паўлам ЖЫЛЮСАМ** прыехалі рабіць «фотасесію» першынца тутэйшай ветраэнергетыкі, сустрэліся з мужчынам, які таксама яго фатаграфаваў.

— Калега-журналіст? — пытаюся.

— Ды не, патэнцыйны інвестар.

Ён, аказваецца, прафесійна займаецца ветраэнергетыкай і ведае аб планах стварэння ў гэтым месцы ветрапарку. Вось і прыехаў «на разведку».

Зразумела, што падставы раскрываць журналістам свае карты ў яго не было. Ды мы асабліва і не настойвалі, бо разумеем, што бізнэс (як і Усход) — справа тонкая, складаная і не заўсёды намеры знаходзяць «кампраміс» з сённяшнімі рэаліямі. Але сам факт зацікаўленасці ў стварэнні ветрапарку каля Навагрудка нешта ж значыць.

Наколькі можа быць варта, так бы мовіць, аўчынка вырабу, зыходзячы з вынікаў працы першага ветрака?

Свае меркаванні на гэты конт выказвае **галоўны інжынер РУП «Гроднаэнерга» Юрый ШМАКАЎ:**

— На працягу 10 месяцаў гэтай устаноўкай выпрацавана электраэнергіі столькі, колькі мы разлічвалі атрымаць за год. Пайшоў ужо другі месяц, як яна працуе, так бы мовіць, у «плюсе».

Такім чынам, пацверджана, што нават па мерках Еўропы, дзе ветракі ўстанаўліваюцца масава, у нас выбраны добрая пляцоўка і эфектыўнае абсталяванне.

**— Складана яго абслугоўваць?**

— Сістэма кіравання ўстаноўкай выведзена на камп'ютары дыспетчара Навагрудскага РЭС і Лідскіх электрычных сетак, а таксама на мой рабочы стол. На сённяшні дзень практычна ўсю працу па яе абслугоўванні могуць выконваць нашы спецыялісты, якія пераймалі вопыт у Кітаі. Абслугоўванне вельмі простае. Акрамя кантролю за нармальнай работай, гэта яшчэ замена расходных матэрыялаў, зліў кандэнсату, апрацоўка кантактных злучэнняў, перазагрузка сістэмы кіравання. За перыяд з моманту ўводу ветраўстаноўкі ў эксплуатацыю прэтэнзій да якасці абсталявання не было. Адзіны збой адбыўся летась, аднак нашы спецыялісты вырашылі праблему без прыцягнення ў Беларусь кітайскіх партнёраў, якія аказалі кансультатыўную дапамогу па сучасных сродках сувязі.

**— Маштабы выпрацоўкі электраэнергіі, зразумела, залежаць ад «капрызаў» надвор'я...**

— Так, мы ж ветрам не кіруем. Ёсць дні, калі ўстаноўка працуе з поўнай нагрузкай, а бывае — стаіць і чакае неабходнай сілы ветру.

**— Калі чакае, расходы ёсць?**

— Так, яна спажывае на ўласныя патрэбы. Ёсць тры датчыкі міні-метэастанцыі, якія сочаць за хуткасцю, напрамкам ветру і разлічваюць, калі ўключыць устаноўку ў работу. Такіх дзён, калі яна наогул не працуе з-за бязветранасці, вельмі мала. Бывае, што яна перыядычна спыняецца, але выпрацоўка электраэнергіі, як правіла, перавышае затраты на ўласнае спажыванне. Здараецца, раніцай ветравая нагрузка дастатковая, днём устаноўка «адпачывае», а вечарам зноў пачынае працаваць.

**— Выкарыстанне энергіі ветру сёння разглядаецца найперш з пункту гледжання эканамічнай выгады альбо як фактар энергетычнай бяспекі краін, якім не хапае ўласных рэсурсаў арганічнага паліва?**

— У Еўропе — ні першае, і ні другое. Там трэцяе — экалогія, скарачэнне выкідаў у атмасферу шкодных рэчываў ад спальвання газу, мазуту, вугалю і іншых відаў арганічнага паліва. Ды і ад спальвання вадкіх відаў паліва навакольнае асяроддзе атрымлівае, так бы мовіць, не вельмі карысныя газы. А ветраўстаноўка не спальвае нічога — выкарыстоўвае вецер. Таму энергія ад яе замяшчае электрастанцыі на арганічным і вадкім паліве.

**— Але ж, мусіць, немагчыма, каб энергія, якую выпрацоўвае вецер, была таннейшая за тую, што атрымліваецца дзякуючы газу альбо гідрарэсурсам?**

— Паводле вынікаў 10 месяцаў эксплуатацыі ветраўстаноўкі каля Навагрудка, сабекошт энергіі практычна роўны з паказчыкам Гродзенскай цеплацэнтралі. Прычым варта зазначыць, што Гродзенская ЦЭЦ, спальваючы ў асноўным газ, працуе вельмі эфектыўна, з высокім каэфіцыентам карыснага дзеяння і нізкім удзельным расходам паліва.

Зразумела, ніхто не стаў бы ўстанаўліваць ветрагенератар толькі дзеля клопату аб экалогіі, паколькі неабходна затраціць значныя сродкі. Таму патрэбна акупляльнасць праекта. Для гэтага ў Еўропе дзяржава стымулюе ўкладанне грошай у ветраўстаноўкі. Таму што, атрымліваючы больш чыстую экалогію, дзяржава скарачае свае расходы на лячэнне людзей, нейкія метады «барацьбы» з кліматам. Такім чынам, у цэлым захоўваецца пэўны парытэт па дзяржаўных расходах.

**— Ці залежыць сабекошт энергіі ад колькасці ветраўстановак?**

— Каб зманціраваць гэтую ўстаноўку, мы заказвалі кран спецыяльнай грузапад'ёмнасці ў Расіі. Можна сабе ўявіць розніцу ў затратах, калі ён прыязджае на мантаж аднаго ветрака ці дзясятка. Да таго ж, адзін падрыхтаваны спецыяліст можа абслугоўваць і адну ўстаноўку, і цэлы ветрапарк. Зразумела, сабекошт энергіі будзе скарачацца. Верагодна і тое, што калі купляецца не адна ўстаноўка, а некалькі, то магчыма зніжка ў цане ад вытворцы.

**— Цікава, якія меркаванні ў дачыненні ветраэнергетыкі ў Беларусі цяпер пераважаюць? Больш аптымістаў ці скептыкаў?**

— Мы з самага пачатку не зведвалі нейкай эйфарыі. Нідзе ў свеце (за выключэннем некалькіх краін, дзе вельмі добрая ветравая нагрузка і доля выпрацоўкі электраэнергіі ад ветру дасягае 30 — 40 працэнтаў ад агульнага аб'ёму) не робяць на гэта стаўку. Толькі хаця б таму, што калі ветраўстановак вельмі многа, то іх трэба нечым замяніць пры адсутнасці ветру. Спажыўцу ж не загадаеш узяць «паўзу». А значыць, неабходна мець рэзервовыя крыніцы энергіі, траціць грошы на іх абслугоўванне і ўключаць у работу, калі не працуе вятрак.

Да ветраэнергетыкі трэба падыходзіць разумна, тым больш, што ў Беларусі абмежаваная колькасць пляцовак, дзе можна эфектыўна выкарыстаць вецер. Але, разам з тым, кожны інжынер, які прааналізуе работу ўстаноўкі каля Навагрудка, скажа, што яна апраўдвае праектныя разлікі. І працуе нават больш эфектыўна, чым першапачаткова меркавалася. Каб расказаць пра нашу ветраўстаноўку, мы падлічылі, колькі яна ўжо выпрацавала электраэнергіі. Калі браць жыллё, то, дапусцім, пры сярэднестатыстычным спажыванні на кватэру 150 кВт электраэнергіі ў месяц, гэтая ветраўстаноўка можа абслужыць каля 2200 сем'яў. Так, не ўвесь Навагрудак. Але ж гэта толькі адна ўстаноўка.

**— Іх будзе больш?**

— У адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай развіцця беларускай энергасістэмы да 2015 года, РУП «Гроднаэнерга» вызначыла дзве перспектыўныя пляцоўкі для будаўніцтва ветрапаркаў. У Навагрудскім раёне, па-суседстве з пакуль адзінай ВЭУ можна зманціраваць яшчэ пяць-сем, а ў Смаргонскім — каля дзесяці. Сумарная гадавая выпрацоўка электраэнергіі можа скласці каля 52 млн кВт/г., што адпавядае 1,3 працэнта спажывання электраэнергіі ўсёй Гродзенскай вобласці. Не так ужо і мала пры паказчыку 2,5 працэнта — такую долю склала пазалетась электраэнергія ад усіх ветрагенератараў свету ў агульным аб'ёме выробленай электрычнай энергіі.

У прыватнасці, ветрапарк каля Навагрудка, магчыма, будзе здольны цалкам забяспечыць электраэнергіяй патрэбы горада. Вядома, гіпатэтычна, бо калі няма ветру, то на энергасістэму працуюць толькі іншыя крыніцы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА**



Ветрагенератар — новы «штрых» у пейзажы Навагрудчыны.



Уваход у вежу ветрагенератара мае «касмічны» выгляд. Тут аб'ектыў фотаапарата ўбачыў начальніка навагрудскіх электрасетак Паўла ЖЫЛЮСА.



Начальнік дыспетчарскай групы Алег ШЧАНСНОВІЧ і дыспетчар Мікалай ПАЎЛОВІЧ абмяркоўваюць аператыўную інфармацыю.

# ЛЕПШ ПРАЦУЮ — БОЛЬШ АТРЫМЛІВАЮ?

## Чаму кіраўнікі марудна пераходзяць на новыя формы стымулявання працы?

**Працадаўцы не вельмі спяшаюцца пераходзіць на перадавыя метады аплаты працы. Па-ранейшаму амаль усе наймальнікі пры налічэнні заробкаў выкарыстоўваюць традыцыйную сістэму аплаты, якая існуе яшчэ з пачатку 1990-х гадоў. І гэта пры тым, што заканадаўства дазваляе па-рознаму стымуляваць працу больш дбайных работнікаў. Чаму так марудна пераходзяць кіраўнікі на новыя формы стымулявання сваіх падначаленых? Як заахвоціць іх змяніць сітуацыю? Гэтыя і іншыя пытанні абмяркоўваліся ў Віцебску падчас тэматычнага семінара з удзелам спецыялістаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

— Уся айчынная сістэма аплаты працы засноўвалася на адзінай тарыфнай сетцы, пачынаючы з 1990-х гадоў. Але эканамічныя змены выклікалі неабходнасць прымяняць гібкія сістэмы аплаты, каб больш актыўна стымуляваць працаўнікоў, — расказаў **Пётр ГРУШНІК, першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.** — Новыя формы аплаты ў ліку іншага маглі б паскорыць тэмпы эканамічнага развіцця краіны. Але ў цэлым па краіне сёння іх выкарыстоўваюць толькі каля 5% арганізацый і прадпрыемстваў.

Семінар правялі менавіта ў Віцебску, таму што ў Прыдзвінскім краі ўжо больш за сто арганізацый і прадпрыемстваў, дзе працуе звыш 20 тысяч чалавек, выплачваюць грошы перадавымі метадамі.

Па-сучаснаму стымулююць работу членаў калектыву Віцебскага камбіната шоўкавых тканін, дзе ў 2,9 раза вырасла вытворчасць, у 1,4 раза — валютная выручка, а заробкі — у 1,6 раза... Спецыялісты міністэрства адзначаюць, што там, дзе прымяняюцца новыя сістэмы аплаты працы, павялічваюцца і аб'ёмы вырабу прадукцыі, экспартных паставак, паніжаюцца вытворчыя выдаткі.

Першы намеснік міністра канстатаваў: ёсць магчымасці зрабіць новыя метады аплаты працы яшчэ больш эфектыўнымі. І адпаведныя прапановы аб магчымых змяненнях у існуючых нарматыўных актах будуць прадстаўлены кіраўніцтву краіны:

— У кожнай арганізацыі могуць быць прыняты свае ўмовы аплаты працы ў залежнасці ад той задачы, якую сёння неабходна вырашаць. Вось, напрыклад, на прадпрыемстве «Віцьба» галоўная мэта — стымуляваць продаж прадукцыі, на што і былі накіраваны ўсе ўмовы стымулявання. Для іншых прадпрыемстваў, магчыма, галоўнымі задачамі будуць павелічэнне экспарту або памяншэнне імпарту.

У кіраўнікоў, у ліку іншага ёсць права выплачваць кароткатэрміновыя і гадавыя бонусы. Можна штомесячна плаціць грашовае ўзнагароджанне ў працэнтах ад атрыманай выручкі, як і ствараць персанальныя ўмовы аплаты працы.

Што датычыцца, мякка кажучы, невялікай актыўнасці кіраўнікоў у гэтым кірунку, сітуацыя тлумачыцца проста: яны не хочуць адмаўляцца ад напрацаванага гадамі. Але без змен і новых форм не абысціся: для больш эфектыўнага вырашэння эканамічных задач давядзецца стымуляваць працу людзей па-іншаму.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ЗДАРЭННІ

## УЛАСНАЯ ДАЧА — ЗА ДЗЯРЖАЎНЫ КОШТ?

**Крымінальная справа, заведзеная ў дачыненні да галоўнага інжынера рамонтна-будаўнічага ўпраўлення ААТ «Віцязь», перададзена ў пракуратуру Віцебскай вобласці.**

На стадыі папярэдняга следства ўстаноўлена, што пры ажыццяўленні будаўніча-мантажных работ на аб'ектах рамонтна-будаўнічага ўпраўлення ён даваў незаконныя ўказанні па адгрузцы будаўнічых матэрыялаў, якія потым апынуліся на яго дачным участку.

— Падначаленыя баяліся, што іх могуць звольніць ці пазбавіць прэміі, таму выконвалі патрабаванні кіраўніка, — расказала **Іна ГАРБАЧОВА, афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці**. — Так, пачынаючы з 2008 года па красавік мінулага года РБУ ААТ «Віцязь» выступала падрадчыкам пры ўзвядзенні 80-кватэрнага дома ў Віцебску. Адначасова ў ліпені мінулага года галоўны інжынер дае незаконныя ўказанні бухгалтэрыі аплаціць кошт 1500 штук цэглы, нібыта неабходных для ўзвядзення сцен дома, які будуецца. Цэглу ў выніку прывезлі на яго дачны ўчастак.

Аналагічным чынам здзяйсняўся крадзеж бардзюраў, раствору, бетону, абліцовачнага каменю, цэменту і іншых будаўнічых матэрыялаў. Некаторыя муляры, якія павінны былі выконваць работы на аб'ектах, насамрэч будавалі дом для галоўнага інжынера. Было таксама ўстаноўлена, што здзяйсненню злачынства спрыяла і адсутнасць належнага кантролю за працай. Шэраг кіраўнікоў ААТ «Віцязь» прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

КРЫМІНАЛ

## У ВЫПАЛЕНАЙ ТРАВЕ ЗНАЙШЛІ ГАСПАДАРА...

**Бліжэй да вечара на прысядзібным участку ў вёсцы Вендзелева Валожынскага раёна суседзі знайшлі цела загінулага са слядамі апёкаў.**

— Гэта быў гаспадар, 42-гадовы мужчына. Побач з ім выгарала сухая трава на плошчы 0,1 гектара, — паведаміў рэдакцыі галоўны спецыяліст цэнтра прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС Аляксей Рак. — Прычыны здарэння высвятляюцца. Пажар яшчэ да прыбыцця падраздзяленняў выратавальнікаў ліквідавалі самі мясцовыя жыхары.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПАКАЛЕЧЫЎ ДЗІЦЯ

**Двухгадовае дзіця з Хойнікаў тэрмінова шпіталізавана ў Гомельскую абласную бальніцу з цяжкімі траўмамі галавы.**

Як расказалі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, раніцай яго 22-гадовая маці адзначала Вялікдзень разам з 57-гадовым непрацуючым знаёмым. Пасля сумеснага распіцця алкаголю грамадзянін нечакана схапіў хлопчыка, вынес з кватэры на лесвічную пляцоўку і некалькі разоў ударыў аб бетон. У дачыненні да затрыманага заведзена крымінальная справа.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Звычайныя цуды

# АДКРЫВАЛЬНІКІ БЯЛЫНІЦКІХ ТАЯМНІЦ

**Старажытны каменны крыж у лесе. Першая на Магілёўшчыне аптэка. Цудатворны абраз Божай Маці. Святая Спаская крыніца. Вёска Майск, якая насамрэч называецца Пупса. Гэта ўсё ёсць у Бялыніцкім краі. Вандроўнік, які праязджае з Магілёва ў Мінск па аўтатрасе, і не заўважыць нічога асаблівага ў невялікім райцэнтры. Між тым, менавіта ў Бялынічах і навакольных вёсках ёсць мноства цікавых мясцін, таямнічых легендаў, выдатных постацяў... І ёсць чалавек, які ўсім гэтым цікавіцца, — галоўны рэдактар Бялыніцкай раённай газеты «Зара над Друццю» Міхась Карпечанка.**



Міхась КАРПЕЧАНКА.

### Іераманах і паэт

— Першым бялыніцкім пісьменнікам быў Зянон Фіш, які нарадзіўся ў 1820 годзе, — расказвае Міхась Карпечанка. — Ён пісаў цудоўныя вершы на польскай мове, якія цяпер перакладзены. Дарэчы, быў адным з выдаўцоў пецярбургскага часопіса «Звезда». А вось сучасны пісьменнік Вячаслаў Казакевіч нядаўна прыязджаў пагасцяваць у родныя Бялынічы з Японіі, дзе жыве амаль два дзясяткі гадоў. Ён філолаг, выкладае рускую мову і літаратуру ва ўніверсітэце Таяма. У яго ўжо ментальнасць японская: галавой ківае, праз слова — японскія «калі ласка» і «дзякуй».

Пісьменнік Мікола Цэлеш (1900 г.н.) працаваў у шахтах, служыў у Чырвонай Арміі. Потым была праца ў дзяржаўных установах, а ў 1944 годзе ён эміграваў за мяжу. Жыў у ЗША і знік без весткі ў 1976 годзе. Жонка яго была ўпэўнена, што ён не памёр, а вярнуўся на сваю любімую радзіму... Літаратуразнаўцы лічаць, што беларускім выдаўцам варта вярнуцца да літаратурнай спадчыны Міколы Цэлеша.

Яшчэ адна постаць у літаратурнай гісторыі Бялыніччыны — Васіль Жудро, іераманах, краязнаўца і паэт. Невядома дакладна, калі і дзе ён нарадзіўся. Яго кнігі пабачылі свет на пачатку XX стагоддзя. Ён служыў у Бялыніцкім манастыры, быў законавучыцелем Бялыніцкай двухкласнай царкоўнапрыходскай школы, у сваіх творах найбольш звяртаў увагу на маральны свет людзей.

### Крыж і сасна

Выданне краязнаўчага энцыклапедычнага даведніка «Бялыніччына» стала падзеяй у Магілёўскай вобласці. У адну кнігу сабраны знакавыя падзеі, знакамітыя асобы і гістарычныя мясціны раёна, і зроблена гэта не ў апошнюю чаргу высілкамі бялыніцкіх журналістаў і краязнаўцаў.

— Нічога мы не ведаем у краязнаўстве! — сцвярджае кіраўнік «Зары над Друццю» ў адказ на пытанне пра тое, што ўсе таямніцы даўно раскрыты і скарбы знойдзены.

Міхась Карпечанка прыводзіць у якасці прыкладу ўжо вядомы цяпер у Беларусі «Заазерскі Стоўнхэндж», названы так па аналогіі з сусветна знакамітай англійскай «Каменнай агароджай». У лесе каля вёскі Заазер'е стаіць вялізны каменны крыж, а навокал яго веерам — некалькі дзясяткаў валуноў з рознымі малюнкамі, у тым ліку і з выявай чалавечка. Капішча гэта ці могілкі — адзінага меркавання няма, але месца сапраўды ўражвае.

— Падавалася, што ў тым Заазер'і ўсё ўжо аблазілі, але гэта не так, — гаворыць апантаны краязнавец. — Сярод камянёў знайшлі адзін следавік — камень, на якім нібыта ёсць адбітак ступні. Але я знайшоў яшчэ два! Так што яшчэ нашы таямніцы недастаткова глыбока вывучаны і пакуль не ўвекавечаны. А гісторыя зніклых вёсак і хутароў? А дыялектная мова і фальклор? А пра што расказваюць нам тапонімы? Так што хопіць працы яшчэ не аднаму пакаленню краязнаўцаў.



Абраз Бялыніцкай Божай Маці, які народ здаўна лічыць цудатворным.





Краязнаўчы энцыклапедычны даведнік «Бялыніччына».

Людзі цягнуцца да таямніц. Напрыклад, многім падаецца, што Заазерскі каменны крыж здымае з чалавека адмоўную энергію. Натуральна, можна ставіцца да такіх рэчаў па-рознаму, але цікавасць ад гэтага толькі расце.

— А нядаўна мне расказалі пра сасну ў бялыніцкім лесе — карані (іх чатыры) і адзін ствол, — ужо будуе планы на новы сезон журналіст і краязнаўца Міхась Карпечанка. — Можа, гэта будзе «сасна жаданняў»?.. Вось і створыцца новая легенда.

### Падземныя хады

Краязнаўца пералічвае ўсё новыя тэмы для пошукаў:

— У Бялынічах былі падземныя хады (на гэты конт ёсць дакладныя сведчанні), але іх так ніхто і не знайшоў. Трэба таксама разгадаць таямніцу абраза Бялыніцкай Божай Маці. Лічыцца, што арыгінал знік на пачатку вайны з Магілёва разам з Крыжам Ефрасінні Полацкай. Але ёсць і іншыя звесткі: напрыклад, пра тое, што ён быў схаваны ў падземных хадах у Бялынічах.

Мала хто ведае, што Бялынічы ў 1924 годзе хацелі перайменаваць у Ленінск. Міхась Карпечанка расказаў, што была такая ініцыятыва настаўніка з вёскі Каліноўка ў сувязі са смерцю правадыра. Але нешта «наверсе» не атрымалася, і Бялынічы засталіся з гістарычнай назвай.

— На возеры паблізу вёскі Карманоўка ёсць выспа, якую называюць Востраў. Вельмі даўно туды вазілі нябожчыкаў і там хавалі — як у грэчаскіх міфах. Я пайшоў туды з праваднікам, і мы знайшлі некалькі валуноў пад соснамі. Расказваюць, што пасля вайны тое месца аблюбавалі мясцовыя самагоншчыкі, таму, у адрозненне ад навакольных вёсак, ніводнага парушальніка алкагольных законаў затрымаць не здолелі...

А ў вёсцы Галоўчын, аказваецца, была першая на Магілёўшчыне аптэка. Яна адкрылася больш за 400 гадоў таму. А калі ў гэтай вёсцы дабудуюць праваслаўную царкву, то мясцовая жанчына, якая знайшла адзін са старадаўніх спісаў (копій) абраза Бялыніцкай Божай Маці, аддасць яго на карысць усіх вернікаў.



Магільны камень на старых могілках у вёсцы Майск, якая калісьці называлася Пупсай.

Людзі не супраць таго, каб дзяліцца з грамадствам сваімі каштоўнасцямі. Між тым, Бялынічы з'яўляюцца ледзь не адзіным раённым цэнтрам у Магілёўскай вобласці, дзе няма краязнаўчага музея. Толькі мастацкі, звязаны з памяццю пра іншага вядомага земляка, мастака Вітольда Бялыніцкага-Бірулю.

### Касцёл і атэіст

Калі ж у Бялыніцкі раён паедуць аўтобусы з турыстамі? Пытанне складанае, бо гісторыя багатая, а паказаць... амаль няма чаго. Мала што цяпер засталося ад Бялынічаў, якія ў старажытнасці былі вядомыя сваімі касцёламі і заможным манастыром. Усё знішчылі і разбурылі, апошняе — у савецкія часы.

Зусім невялікім атрымаўся ў Карпечанкі пералік таго, што нейкім цудам ураталавася ад часу і людзей — пераважна падмуркі, капліцы на могілках, святыя крыніцы. Ёсць яшчэ сцены касцёла ў аграгарадку Свяцілавічы — яго калісьці ўзвялі сёстры, каб замаліць грахі брата, які страціў веру ў Бога пасля вялікіх пакут (як мяркуюць, пасля паўстання Каліноўскага, за кратамі альбо ў ссылцы).

— Праграма, якая паступова рэалізуецца Бялыніцкім райвыканкамам па ўвекавечванні гістарычнай памяці, павінна стаць апірышчам і для турызму, — лічыць галоўны рэдактар «Зары над Друццю». — Калі ўжо няма касцёла, то трэба хаця б на тым месцы ўсталяваць валун з яго выявай. Гэта таксама будзе цікава.

На думку Карпечанкі, абавязкова трэба зрабіць мемарыяльную дошку Люцыяна Гадлеўскага, апошняга святара Бялыніцкага касцёла. Дарэчы, менавіта яго падазраюць у падмене бялыніцкага цудатворнага абраза копіяй — для таго, каб не аддаваць каштоўнасць іншай канфесіі.

— Але ён яшчэ таксама адкрыў у 1860 годзе школку па навучанні дзяцей арганнай музыцы, і для гэтага запрасіў прафесара Груна з пражскай кансерваторыі, — працягвае краязнавец. — Талерантны настаяцель касцёла не дзяліў дзяцей на сваіх і праваслаўных. Усе дзеці займаліся бясплатна, але павінны былі іграць на святах.

### Чалавек дапытлівы

— Як я даведваюся пра такія рэчы? Проста размаўляю з людзьмі! — шчыра кажа Міхась Карпечанка. — І не думайце, што самі людзі такімі рэчамі не цікавяцца: адзін мужчына нядаўна адшукаў звесткі пра свой радавод ажно з 1840 года! Таму што чалавеку, разумнаму і дапытліваму, проста ўласціва ведаць свае карані. Таму і краязнаўства будзе жыць вечна.

Сам Міхась збіраецца ў сваім пенсійным будучым (яшчэ досыць далёкім!) заняцца аграэкатурыстычным бізнэсам.

— Цяпер адпачынак у сельскай мясцовасці скіраваны больш на шашлыкі ды карпаратывы, але з цягам часу гэта зусім надакучыць, — лічыць ён. — Трэба, каб турызм быў пазнавальным, і гэта можна гаспадарам сельскіх сядзіб рабіць і цяпер. Ім могуць дапамагчы вясковыя настаўнікі і вучні, якіх трэба проста заахвоціць на распрацоўку цікавага гістарычнага маршруту.

Ад бялыніцкіх таямніц, тым больш калі пра іх распавядае адукаваны і цікавы чалавек, сапраўды не адарвацца. Міхась Карпечанка і яго калегі, журналісты і краязнаўцы, выклікалі інтарэс да гістарычных дэталяў, на першы погляд нязначных — затое, з іншага погляду, яны захопліваюць у палон і не адпускаюць...

**Ілона ІВАНОВА**

■ Рэспубліканская акцыя

# Міма інфаркту і інсульту...

**У межах агульнарэспубліканскай акцыі «Беражы здароўе змоладу. Прайдзі міма інфаркту і інсульту», якая адбудзецца 19 і 20 красавіка, урачы-кардыёлагі плануюць ацаніць распаўсюджанасць фактараў рызыкі ў пацыентаў, якія звяртаюцца ў лячэбныя ўстановы. Асобная ўвага будзе ўдзяляцца навучанню вымярэнню артэрыяльнага ціску, выяўленню такіх паталогій, як артэрыяльная гіпертэнзія, сардэчная недастатковасць і парушэнне сардэчнага рытму.**

## ПІЦЬ ТАБЛЕТКІ — МАЛА

Першае, што патрабуецца ад хворага на артэрыяльную гіпертэнзію — строга вытрымліваць рэкамендацыі ўрача і ні ў якім разе самавольна не спыняць лячэнне! «Прагноз лячэння гіпертаніі можа палепшыцца толькі ў выпадку неперарыўнасці лячэння, — падкрэслівае вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі артэрыяльнай гіпертэнзіі РНПЦ «Кардыялогія» Вольга ПАЎЛАВА. — Акрамя таго, пацыентам, якія памылкова мяркуюць, што прыём 1-2 таблетак з'яўляецца дастатковым для добрага прагнозу, можна сказаць наступнае: калі вы ігнаруеце немедыкаментозныя метады лячэння, значыць, вам неабходна прымаць значна больш лекавых прэпаратаў. А чым больш таблетак, тым, зразумела, больш пабочных рэакцый».

### Гіпертоніку трэба мець на ўвазе:

✓Кожны лішні кілаграм павышае ціск на 1-3 мм рт. сл.

✓Фізічная актыўнасць — 30-40 хвілін 3-4 разы на тыдзень — спрыяе павышэнню адаптацыйных магчымасцяў арганізма, мышачнай сіле і вынослівасці.

✓Змяншэнне паваранай солі — да 5 гр. за суткі — зніжае ціск на 4-6 мм рт. сл.

✓Ужыванне алкаголю з'яўляецца моцным правакатарам развіцця гіпертанічных крызаў і сардэчна-сасудзістых ускладненняў.

✓Не рэкамендуецца адначасовае ўжыванне гіпатэнзіўных сродкаў і алкаголю.

✓Зніжэнне ўзроўню артэрыяльнага ціску і халестэрыну ў крыві ўсяго на 10 працэнтаў спрыяе зніжэнню агульнай рызыкі сардэчна-сасудзістых ускладненняў на 45 працэнтаў.

✓Кантроль артэрыяльнага ціску на прыёме ва ўрача і ў хатніх умовах — залатое правіла.

## ЗБІЛАСЯ З РЫТМУ

70 працэнтаў хворых з сардэчнай недастатковасцю, якая ўносіць важкі ўклад у структуру смяротнасці і інвалідызацыі працаздольнага насельніцтва, нават не падазраюць аб наяўнасці ў іх такой праблемы.

Сэрца забяспечвае наш арганізм крывёй, з якой ва ўсе органы і тканкі паступаюць жыццёва неабходныя кісларод і карысныя рэчывы. Калі сэрца не выконвае сваю функцыю належным чынам, усе органы і тканкі пакутуюць. У першую чаргу пачынаюцца праблемы з печанню, лёгкімі і ныркамі, што абумоўлівае заўчасную гібель пацыента ад хранічнай поліарганнай недастатковасці. Задышка, хуткая стамляльнасць, сэрцабіццё і кашаль павінны не проста насцярожыць, а «накіраваць» да ўчастковага ўрача.

«Хранічную сардэчную недастатковасць могуць выклікаць спадчынныя і набытыя пашкоджанні клапанаў сэрца, міякарда (у тым ліку віруснае), каранарных сасудаў, — кажа ўрач-кардыёлаг 3-га кардыялагічнага аддзялення РНПЦ «Кардыялогія» Ірына ГРЭБІНЮК. — Акрамя таго, сэрца можа пакутаваць і ў пацыентаў з высокай масай цела, высокім узроўнем халестэрыну, з цукровым дыябетам, хранічнай абструктыўнай хваробай лёгкіх, захворваннямі шчытападобнай залозы, а таксама ў выніку злоўжывання таксічнымі рэчывамі — алкаголем і наркотыкамі».

Для лячэння пацыентаў з сардэчнай недастатковасцю выкарыстоўваецца тры групы прэпаратаў. Прычым толькі штодзённая, бесперапынная тэрапія дапамагае пазбавіцца такіх непрыемных сімптомаў як ацёчнасць у канечнасцях, застой вадкасці ў лёгкіх і паляпшае доўгатэрміновы прагноз, прыпыняе прагрэсаванне захворвання. У крайніх выпадках прымяняюцца і хірургічныя метады лячэння, у тым ліку трансплантацыя.

## СА СТЫМУЛЯТАРАМ УНУТРЫ

Страта прытомнасці па прычыне парушэння сардэчнага рытму можа стаць паказаннем да такога ўмяшання, як радыёчастотная абляцыя, якая прымяняецца як у РНПЦ «Кардыялогія», так і ў некаторых абласных цэнтрах і гарадскіх бальніцах. Аднаразовая маніпуляцыя пазбаўляе пацыента парушэння рытму сэрца.

«Пазітыўнай тэндэнцыяй у справе лячэння памянёнай паталогіі становіцца стабільны рост колькасці імплантацый кардыёстымулятараў тым, хто мае парушэнні рытму сэрца, звязаныя з рэдкім сэрцабіццём, паўзамі, абумоўленымі сіндромам слабасці сінусавага вузла, — удакладняе вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі парушэння сардэчнага рытму РНПЦ «Кардыялогія» Дзмітрый ГАНЧАРЫК. — За апошнія тры гады колькасць імплантацый вырасла на 15-20 працэнтаў. Такіх пацыентаў неабходна выяўляць як мага раней, каб яны не траплялі ў сітуацыі страты прытомнасці і атрымання сур'ёзных траўмаў».

Актыўна развіваецца сёння і імплантацыя кардыястымулятара-дэфібрылятара, з функцыяй, так бы мовіць, электрашокера — для тых выпадкаў, калі сэрца раптоўна пачынае біцца вельмі хутка, звыш 200 удараў у хвіліну, што адэкватна спыненню кровазвароту. У такога пацыента моцна падае ціск і ўзнікае пагроза жыццю. Летась спецыялісты імплантавалі 130 такіх кардыястымулятараў-камп'ютараў.

Часцей пачалі ўстанаўлівацца і больш рэдкія, спецыялізаваныя кардыястымулятары, здольныя палепшыць помпавую функцыю сэрца, вялікія памеры якога не дазваляюць сінхронна працаваць розным камерам.

## ТРЭБА ПАСТАРАЦЦА

Агульная смяротнасць ад хвароб сістэмы кровазвароту знізілася ў 2011 годзе на 3 працэнты ў параўнанні з годам 2010-м. Аднак смяротнасць сярод працаздольнага насельніцтва летась вырасла на 3 працэнты ў параўнанні з 2010-м. Прычыну такога становішча спецыялісты бачаць у адсутнасці матывацыі да захавання здароўя. Дастаткова сказаць, што палова загінулых у выніку хвароб сістэмы кровазвароту злоўжывалі алкаголем.

**КЛАПАЦІЦЦА АБ ЗДАРОЎІ САРДЭЧНА-САСУДЗІСТАЙ СІСТЭМЫ — ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ:**

**1. Не курыць (адсутнасць пасіўнага курэння).**

**2. Не злоўжываць алкаголем.**

**3. Мець узровень халестэрыну менш за 5 ммоль/л (для здаровых людзей).**

**4. Мець узровень ліпапратэідаў нізкай шчыльнасці менш за 3 ммоль/л.**

**5. Забяспечыць сабе ўмераную фізічную актыўнасць.**

**6. Ужываць не менш за 5-6 штук садавіны і гародніны штодня.**

**7. Кантраляваць масу цела.**

**8. Кантраляваць узровень глюкозы ў крыві.**

**9. Лячыць цукровы дыябет.**

**Святлана БАРЫСЕНКА** ■

---

95 ЗВЯЗДА

# Мы змагаліся за Радзіму — рабілі тое, што павінны былі зрабіць

**Працягваем размову:**

## Ці з'явіцца ў Беларусі Дзень партызанаў і падпольшчыкаў Вялікай Айчыннай вайны?

*(Пачатак тэмы ў «Звяздзе» за 24 сакавіка, 5 і 10 красавіка.)*



Ганаруся, што мая родная «Звязда», куды я прыйшоў працаваць журналістам адразу пасля вызвалення Беларусі ў 1944 годзе, узняла такую важную тэму, як усталяванне Дня партызанаў і падпольшчыкаў. Гэта яшчэ раз сведчыць: наша газета і ў вайну, і ў пасляваенныя гады — заўсёды! — трывала стаяла і стаіць на пазіцыях патрыятызму, не адыходзіць ад праўды жыцця і гістарычнай справядлівасці, як бы каму ні хацелася перапісаць мінулае.

Я нарадзіўся ў 1919 годзе ў вёсцы Доктаравічы Капыльскага раёна, там жа скончыў сямігодку. Далей была служба ў арміі і вайна. У кастрычніку 1942 года ўступіў добраахвотнікам у партызанскі атрад імя С.М. Будзённага. Ніхто не аддаваў ніякіх загадаў, ніхто не прымушаў. Вораг напаў на нашу Радзіму, заліў яе крывёю — хіба можна было спакойна назіраць за ўсім гэтым? Альбо, яшчэ горш, — стаць прыслужнікам акупанта, аблізваць нямецкія боты?..

Мы змагаліся за Радзіму — рабілі тое, што павінны былі зрабіць.

Дзень партызанаў і падпольшчыкаў стаў бы нагодай для таго, каб яшчэ раз успомніць патрыётаў, лепшых сыноў і дачок Беларусі, якім ніхто не даваў загаду змагацца за сваю Радзіму, — яны рабілі свой выбар самастойна і асэнсавана.

**Янка КАЗЛОЎ,**
**былы партызан атрада імя С.М. Будзённага, радыст беластоцкай падпольнай газеты «Белостокская правда» і антыфашысцкай моладзевай газеты «Молодой партизан».**

**Янка Казлоў адпрацаваў у рэдакцыі найстарэйшай беларускай газеты «Звязда» больш як 40 гадоў. У 1944 годзе яму было ўсяго 25. Але на той час гэта ўжо быў сфарміраваны чалавек з няпростай ваеннай біяграфіяй.**

*З баявой характарыстыкі на партызана-радыста Беластоцкага абкама КП(б) Беларусі, члена ЛКСМБ Казлова Івана Кандратавіча:*

*«Тав. Казлоў прыбыў добраахвотна ў партызанскі атрад імя С.М. Будзённага ў кастрычніку 1942 года. За час знаходжання ў атрадзе паказаў сябе дысцыплінаваным, ініцыятыўным, знаходлівым, вынослівым байцом-партызанам. Тав. Казлоў карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод партызанаў і камандзіраў. Тав. Казлоў мае на сваім баявым рахунку наступнае:*

*1. Узарваны мост на шасэйнай дарозе Слуцк—Капыль.*

*2. З групай колькасцю 12 чалавек узарваў спіртзавод у саўгасе «Доктаравічы», у выніку выбуху забіты 34 гітлераўцы.*

*3. У жніўні месяцы 1943 года ў складзе атрада ўдзельнічаў у «рэйкавай вайне». Атрадам падарваны 540 рэек.*

*Тав. Казлоў удзельнічаў у 15 баях і дробных сутычках з нямецкімі акупантамі і паліцыяй. Актыўна працаваў па ўзбраенні і росце асабовага складу атрада. У кастрычніку 1943 года тав. Казлоў быў пераведзены ў абкам КП(б) Беларусі на пасаду радыста рэдакцыі Беластоцкай абласной падпольнай газеты «Белостокская правда»... За сваю выдатную працу ў складаных умовах варожага тылу тав. Казлоў І.К. прадстаўлены Беластоцкім падпольным абкамам КП(б) Беларусі да ўрадавай узнагароды — ордэна Айчыннай вайны першай ступені».*

У кнізе «В Принеманских лесах» (выдавецтва «Беларусь», 1975) апісваецца ў тым ліку і баявы шлях партызана Янкі Казлова.

...І зараз Іван Кандратавіч — уважлівы чытач і актыўны дарадца «Звязды». Прычым пачуццё гумару ў нашага старэйшага калегі застаецца бліскуча-бездакорным — невыпадкова ён быў калісьці адным з лепшых беларускіх фельетаністаў!

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

---

■ Моладзь у навуцы

# АДКРЫЦЦЁ ДЗІЦЯЧАГА ХІРУРГА

**Мяне заўсёды цікавілі людзі навукі — тыя, хто з галавой умее акунуцца ў сваю справу і не звяртаць увагу ні на недахоп часу, ні на жыццёвыя спакусы. Яны працаголікі і энтузіясты адначасова. Гэта тыя людзі, за плячыма якіх ляжаць адкрыцці айчыннай навукі, а іх галовы — скарбніца ведаў. Аднак што іх матывуе, кім яны з'яўляюцца ў прыватным жыцці і дзе шукаюць ключы да вялікіх дасягненняў?**



Па адказы на гэтыя пытанні я звярнулася да маладога вучонага, які ўжо паспеў зрабіць імя ў навуцы і сабраць вакол сябе маладых даследчыкаў краін СНД. Уладзімір Казбанаў — дзіцячы хірург, аспірант Інстытута фізіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. Ён жа з'яўляецца каардынатарам і ініцыятарам адразу трох праектаў, якія праходзяць на гэтым тыдні: міжнароднай канферэнцыі «Моладзь у навуцы — 2012», міжнароднага форуму студэнтаў і навучэнцаў «Першы крок у навуку — 2012», і ў межах гэтых дзвюх падзей асобнага праекта «INMAX-12».

Навуковец на ўсё знаходзіць час і яшчэ паспявае сустрэцца з журналістамі, якія не абдзяляюць увагай яго персону. Пагутарыўшы з гэтым маладым чалавекам, я зразумела, што ў аснове яго асобы — настойлівасць у дасягненні мэты, аптымістычнае стаўленне да жыцця і вялікая любоў да людзей, да дзяцей у прыватнасці.

Казбанаў расказаў карэспандэнту «Звязды» пра свае навуковыя распрацоўкі, практычныя дасягненні і жыццёвыя прыярытэты:

***— Уладзімір, вы з'яўляецеся тройчы лаўрэатам прэміі Спецыяльнага фонда Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы таленавітай моладзі, двойчы адзначаны падзякай старшыні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук...***

— Усе гэтыя дасягненні — заслугі ў першую чаргу не мае, а маіх выкладчыкаў — тых людзей, якія некалі падтрымалі імкненне займацца навукай, граматна выбудавалі план маіх даследаванняў і на этапе выканання заўсёды дапамагалі, інтэрпрытавалі тыя вынікі, якія я атрымліваў.

Што з'яўляецца асноўным у маіх даследаваннях? На другім курсе медыцынскага ўніверсітэта я пайшоў у гуртох дзіцячай хірургіі, і мой навуковы кіраўнік Юрый Дзягцяроў прывёў мяне ў Інстытут фізіялогіі НАН, дзе я ўпершыню ў жыцці ўзяў у рукі скальпель, трымальнік і ў лабараторных умовах ажыццявіў сваю першую аперацыю на лабараторных жывёлах. За гэтым паследаваў шэраг разнастайных эксперыментаў. Сярод іх найбольш значнымі для мяне з'яўляліся даследаванні сумяшчальнасці тытанавых імплантантаў з алмазападобнымі пакрыццямі — за гэтыя распрацоўкі я і атрымаў узнагароды.

Часам нам здаецца, што пэўныя прэміі і перамогі ў жыцці — гэта нешта недасяжнае і ў гэтым кірунку нават не трэба працаваць, што гэта ўсё за аблокамі. Гэта не так: існуе штогадовы конкурс навуковых прац пры Міністэрстве адукацыі, куды кожны студэнт можа адпраўляць свае работы. Па гэтаму шляху я і пайшоў, пачынаючы з другога курса, і паступова стаў атрымліваць нейкія адзнакі, а пасля і атрымаў званне лаўрэата.

***— Распрацаваны вамі від імплантантаў зараз выкарыстоўваецца ў айчыннай медыцыне?***

— Справа ў тым, што найбольш распаўсюджаныя зараз імплантанты зроблены з тытану. Метал — гэта найлепшы матэрыял па фізічных і біялагічных паказчыках. Але любы чужародны агент наш арганізм успрымае агрэсіўна, з той або іншай выяўленасцю. Калі гэты канфлікт дастаткова высокі, аперацыі, якія праводзяцца з выкарыстаннем імплантантаў, прыносяць не карысць, а шкоду, бо пачынаюцца загнаенні, інфекцыі. Медыцына ва ўсім свеце на сённяшні дзень шукае новыя матэрыялы, якія былі б біялагічна сумяшчальнымі, на якія арганізм рэагаваў бы мякка.

Адну з такіх новых тэхналогій пачалі выкарыстоўваць у нас у краіне, — гэта алмазападобныя пакрыцці на тытанавых імплантантах. Даследаваць іх якасці пачалі не ў медыцыне, а ў фізіка-тэхнічным інстытуце НАН. Гэтыя пакрыцці на 60-70% набліжаюцца да шчыльнасці алмаза, хоць уяўляюць сабой вельмі тонкія плёнкі. Пасля ў іх сталі дадаваць яшчэ і наначасціцы серабра, якія надалі ім новыя ўласцівасці, дастаткова цікавыя. Мы ж сталі даследаваць іх медыцынскія якасці, праводзячы эксперыменты на жывёлах і на культуры клетак. Сёння мы бачым, што такія імплантанты больш сумяшчальныя з арганізмам, ён успрымае іх нашмат лепш. Гэтае пакрыццё стала набліжаным да ідэальнага: мы спадзяёмся, што ў будучыні аперацыі па замене імплантанта на новы трэба будзе праводзіць вельмі рэдка або ўвогуле стане дастаткова аднаразовай установкі пратэза.

***— Чаму вы вырашылі лячыць менавіта дзяцей?***

— Я заўсёды лёгка знаходзіў з імі агульную мову — і ў мяне гэта выклікала вельмі яскравыя адчуванні. Таму, калі я паступаў у медыцынскі ўніверсітэт, то адразу выбраў педыятрычны факультэт. Некаторыя эпізоды маёй урачэбнай дзейнасці пацвярджаюць, што выбар правільны: з практыкі ў медыцынскім універсітэце я вяртаўся не толькі з дзённікам запісаў загадчыка аддзялення, але і са стосам дзіцячых малюнкаў з вершамі, прысвечанымі «Доктару Уладзіміру Уладзіміравічу» або «Дзядзьку Вову» — як яны пісалі. Тады я зразумеў, што падыход да дзяцей, відаць, правільны знайшоў.

Зараз я займаюся навукай, але ўпэўнены, што пасля заканчэння аспірантуры абавязкова вярнуся ў медыцыну — такая настальгія часам бывае. Я працаваў таксама ўрачом хуткай дапамогі, і менавіта там, пасля змены, нягледзячы на стомленасць, я адчуваў найвялікшае ўнутранае задавальненне і разуменне, што прыношу карысць.

***— Калі не медыкам, то кім бы вы былі?***

— Настаўнікам. Мне здаецца, кожны чалавек унутры сябе ведае, што важна і трэба рабіць зараз і што ён хацеў бы рабіць. Часам мне вельмі хочацца зацішша — тады б я быў проста ў раі: мець зносіны з дзецьмі, няхай гэта настаўніцкая або медыцынская дзейнасць, перадаваць ім свой пазітыў, сваю радасць і, адпаведна, у іх усмешках атрымліваць свой настрой — свой заробак.

Яшчэ я мог бы займацца дабрачыннай дзейнасцю, і не толькі як удзельнік, але як арганізатар працэсу. Таму што сёння вельмі шмат дзяцей — як у дамах-інтэрнатах, так і ў звычайных сем'ях — якім неабходны клопат і любоў, што даюць надзею і радасць. На жаль, у працэсе маёй урачэбнай практыкі ў мяне складваецца такое ўражанне, што многія дзеці становяцца або азлобленымі, або аддаленымі ад свету і інтарэсы маюць далёка не высокамаральныя. Іх бацькі кажуць, што вельмі складана выхоўваць, падкрэслю, сапраўднага чалавека. Прасцей забяспечыць яго матэрыяльна — даць малому грошай, каб яно адчапілася або каб пахвалілася перад аднакласнікамі, суседзямі. Нашмат больш складана сядзець з дзіцем і рабіць урокі, нешта тлумачыць...

***— На сённяшні дзень вы ўжо шмат дасягнулі, як у навуцы, так і ў практычнай дзейнасці. Якія якасці ў сабе трэба развіваць, каб быць паспяховым і шмат чаго дабіцца?***

— У першую чаргу трэба вызначыць сваю галоўную мэту ў жыцці і фармуляваць яе, сыходзячы са сваіх інтарэсаў, з таго, што добра атрымліваецца. Важна запасціся вялізнай цярплівасцю. Чалавеку, які пачынае нечым вылучацца, заўсёды будзе вельмі складана, ён пастаянна будзе спатыкацца аб камень неразумення, непрымання. Ні ў якім разе нельга кідаць справу, калі штосьці не атрымліваецца або нехта пачынае ўстаўляць палкі ў колы. Тут ёсць адзін важны памочнік: калі мы робім штосьці толькі дзеля сябе, то ў нас ёсць матывацыя, але не надта моцная; самы вялікі стымул — гэта разуменне, што ты робіш штосьці для іншых і пры гэтым адчуваеш адказнасць перад імі — тут ты ўжо не праспіш, не зможаш нешта недарабіць. І яшчэ — ніколі не аддзяляйце свае інтарэсы ад інтарэсаў дзяржавы — яны заўсёды павінны быць разам.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ** ■

---

# «ЦАНА ФАРМІРУЕЦЦА З УЛІКАМ ВЫДАТКАЎ НА ВЫТВОРЧАСЦЬ...»

| 2 | Изменения статей капитала | 3012 | - | - | - | 30 791,7 | 793,9 | 31 585,6 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 30 791,7 | 793,9 | 31 585,6 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | - | - | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | x | - | x | - |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 2.8 | Остаток на 1 января 2011 г. | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 3 | Остаток на конец года | 3013 | 62 287,0 | - | 3 114,3 | 48 117,9 | 1 056,9 | 114 576,1 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2011 г. | 3011 | 62 287,0 | - | 3 114,3 | 48 117,9 | 1 056,9 | 114 576,1 |
| 5 | Изменения статей капитала | 3012 | 82 500,0 | - | 4 125,0 | 15 566,2 | 2 720,9 | 104 912,1 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 19 691,3 | 2 720,9 | 22 412,2 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 4 125,0 | (4 125,0) | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 82 500,0 | - | x | - | x | 82 500,0 |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 82 500,0 | - | x | x | x | 82 500,0 |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (0,1) | - | (0,1) |
| 6 | Остаток на 1 января 2012 г. | 3013 | 144 787,0 | - | 7 239,3 | 63 684,1 | 3 777,8 | 219 488,2 |

### СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2011 год | 2010 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | | 19 691,3 | 30 791,7 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | | 2 720,9 | 793,9 |
| 2.1 | В том числе: переоценка основных средств | 3012121 | | 2 720,9 | 793,4 |
| 2.2 | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | | 0,5 |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | | | 22 412,2 | 31 585,7 |

### ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2011 г. | 2010 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 39 522,8 | 20 994,6 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (50 059,2) | (6 571,0) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 128 674,8 | 73 749,1 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (5 609,5) | (3 367,9) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 868,3 | (107,5) |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | 37 966,5 | - |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 11 710,4 | 5 239,7 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (90 908,2) | (40 696,6) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (10 161,3) | (10 985,0) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах, итого | 701 | | 62 004,6 | 38 255,4 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (256,8) | (63 312,2) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (92 216,0) | 841,9 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | - | - |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (193 433,7) | (96 773,2) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (1 157,2) | (5 946,6) |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов, итого | 702 | | (287 063,7) | (165 190,1) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | - | 63 422,7 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 57 645,2 | 73 382,1 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 109 506,3 | (8 352,4) |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | - | - |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 6 061,9 | (130,3) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств, итого | 703 | | 173 213,4 | 128 322,1 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | (51 845,7) | 1 387,4 |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (6 743,9) | (3 098,4) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 188,0 | (26,7) |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | (6 555,9) | (3 125,1) |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | 82 500,0 | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | - | - |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | 82 500,0 | - |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 9 652,1 | (597,6) |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | 33 750,5 | (2 335,3) |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | | x | 3 213,2 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | | 36 963,7 | x |

**Председатель Правления** **А.Н. Табатадзе**

**Главный бухгалтер** **Г.П. Лаптенок**

**Дата подписания «21» марта 2012 года**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 18 от 29.11.2007 г.
Свидетельство о государственной регистрации № 807000056 от 10.07.2002 г. УНП 807000056.

KPMG

**ООО «КПМГ»**
ул. Димитрова, 5
Помещение 9
220004, Минск, Беларусь

Телефон +375 (17) 306 08 03
Факс +375 (17) 306 08 12
Моб. + 375 29 104 75 15
Интернет www.kpmg.by

Акционерам
ОАО «ХКБанк»
ул. Одоевского, д. 129
г. Минск
Республика Беларусь
220018
ОАО «ХКБанк» зарегистрировано
в Национальном банке Республики Беларусь 10.07.2002,
регистрационный номер 807000056.

Исх. номер 2203-03

**Аудиторское заключение по годовой финансовой отчетности ОАО «ХКБанк» за 2011 год**

Мы провели аудит прилагаемой годовой финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Хоум Кредит Банк» (далее — «Банк»), состоящей из бухгалтерского баланса на 1 января 2012 года, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала и отчета о движении денежных средств за 2011 год, а также пояснительной записки.

*Ответственность руководства относительно годовой финансовой отчетности*

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и объективное представление годовой финансовой отчетности в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, а также за систему внутреннего контроля, которая, по его мнению, является необходимой для подготовки годовой финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, вызванных мошенничеством либо ошибкой.

*Ответственность аудиторов*

В наши обязанности входит выражение мнения о годовой финансовой отчетности на основе проведенного нами аудита, а также предоставление сведений о выполнении Банком нормативов безопасного функционирования и состоянии внутреннего контроля Банка.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь и Международными стандартами аудита, если они не противоречат названным требованиям. Эти стандарты и требования обязывают нас соответствовать этическим требованиям и планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить разумную уверенность в том, что годовая финансовая отчетность не содержит существенных искажений.

Аудит включает в себя проведение процедур для получения аудиторских доказательств по суммам и раскрытиям, представленным в годовой финансовой отчетности. Отбор процедур проводится на основании суждений аудитора, включающих оценку риска наличия существенных искажений в годовой финансовой отчетности, вне зависимости от того, явилось ли их причиной мошенничество или ошибка. При оценке данного риска аудитор рассматривает работу системы внутреннего контроля, относящуюся к подготовке и объективному представлению годовой финансовой отчетности Банка, в целях разработки соответствующих аудиторских процедур, но не в целях выражения мнения об эффективности работы самой системы внутреннего контроля Банка. Аудит также включает в себя оценку приемлемости используемой учетной политики, обоснованности оценочных значений, сделанных руководством Банка, и оценку общего представления годовой финансовой отчетности.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства обеспечивают достаточные и надлежащие основания для выражения нашего аудиторского мнения.

*Аудиторское мнение*

По нашему мнению, годовая финансовая отчетность достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение Открытого акционерного общества «Хоум Кредит Банк» на 1 января 2012 года, а также результаты его деятельности и движение денежных средств за 2011 год, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, касающимися подготовки годовой финансовой отчетности.

**Заключение по иным требованиям законодательства**

В наши обязанности также входит оценка методики расчетов и достоверности информации, включенной в формы пруденциальной отчетности 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе», 2809 «Расчет ликвидности», составленные Банком и представляемые на 1 января 2012 года. Ответственность за подготовку данных форм пруденциальной отчетности несет руководство Банка. В наши обязанности входит выражение мнения о достоверности указанных форм пруденциальной отчетности.

По нашему мнению, вышеназванные формы пруденциальной отчетности на 1 января 2012 года составлены Открытым акционерным обществом «Хоум Кредит Банк» достоверно во всех существенных аспектах в соответствии с Инструкцией о порядке составления и представления банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями пруденциальной отчетности в Национальный банк Республики Беларусь, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 31 октября 2006 года № 172 (с учетом дополнений и изменений).

В ходе аудита нами было установлено, что Банком были допущены факты несоблюдения в 2011 году нормативов безопасного функционирования, установленных Национальным банком Республики Беларусь для банков, изложенные в подразделах 9.2, 9.6 и 9.7 раздела 9 «Политика Банка в области управления рисками» пояснительной записки. Другие факты несоблюдения нормативов безопасного функционирования, установленные Национальным банком Республики Беларусь для банков, в 2011 году не выявлены.

Мы также не обнаружили факты, свидетельствующие о несоответствии состояния системы внутреннего контроля Банка характеру и объему осуществляемых им операций, которые могли бы привести к существенному искажению годовой финансовой отчетности Банка за 2011 год.

**Верещагина Ирина Владимировна**
Директор

**Абойшева Анна Михайловна**
Руководитель аудиторской группы

22 марта 2012 года

г. Минск, Республика Беларусь

Общество с ограниченной ответственностью «КПМГ».

Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским горисполкомом на основании решения от 10.02.2011, УНП 191434140

КПМГ, общество с ограниченной ответственностью и фирма-член сети независимых фирм КПМГ, входящих в состав КПМГ Интернейшнл Кооператив («КПМГ Интернейшнл»), ассоциации, созданной по законодательству Швейцарии.

УНП № 191434140
Юридический адрес:
г. Минск, ул. Димитрова, 5
Помещение 9
220004 Минск Беларусь

■ Пытальнік

# КУДЫ ВЯСКОЎЦУ МОЖНА ЗДАЦЬ ВОЎНУ?

**Маю 20 мяхоў воўны, хацеў бы набыць валёнкі. Іх робяць у суседняй вобласці, у Смілавічах. Вельмі зручны абутак у зімовы час для тых, хто працуе на марозе. Раней у раёне можна было здаць і воўну, і скуры. А цяпер не прымаюць, і людзі ўсё гэта закопваюць у зямлю, паляць на вогнішчах, выкідваюць на сметніцы...**

**Іосіф Валяр'янавіч КАЛЯДА,**
*п/а Лешчанка Шчучынскага раёна.*

Такое пытанне ў нашай рэдакцыйнай пошце за апошнія гады — не першае. Раней ужо таксама даводзілася адказваць і пра здачу насельнікам воўны, і пра магчымасць вырабіць валёнкі з яе. Ці змянілася што за прайшоўшы час?

— Ваш чытач мае рацыю: насельніцтва сапраўды не можа здаць воўну. Прынамсі, у нашым раёне яе, як і іншую сыравіну такога ж кшталту (шкуркі трусоў, авечак), не прымаюць як мінімум недзе з дзесяць гадоў. Хоць мы ўвогуле нарыхтоўваем каля 20 найменняў сыравіны. Толькі вось гэтых пазіцый у пераліку няма, — адказала на наш запыт выканаўца абавязкаў намесніка дырэктара па нарыхтоўках і знешнеэканамічнай дзейнасці Шчучынскага філіяла Гродзенскага абласнога спажывецкага таварыства Наталля Русіновіч. — А ўсё таму, што ў краіне няма рынку збыту... Воўна павінна быць вымытая, з ветэрынарным пасведчаннем, а правядзенне аналізу для прыватніка будзе каштаваць пэўных грошай. З іншага боку, ужо ў нарыхтоўшчыкаў узнікаюць праблемы з захоўваннем такой сыравіны. Паколькі яна ўспрымальная да вільгаці, ёй трэба забяспечыць адпаведныя ўмовы...

У гэтай сувязі можна яшчэ прыгадаць, што пагалоўе авечак у краіне ўжо не тое, што некалі. Ды і колькі ў канкрэтнага чытача засталося б той воўны з вышэйназваных ім 20 мяхоў, калі яе як след вымыць і вычасаць? А на Смілавіцкую валяльна-лямцавую фабрыку сыравіна для вырабу валёнак паступае вагонамі. Прычым воўна ідзе не любая, а, да прыкладу, ад авечак, што вырошчваюцца ў Сярэдняй Азіі...

■ Мясцовы час

# ДАХ НАД ГАЛАВОЙ — ЯШЧЭ НЕ ГАРАНТЫЯ. АЛЕ ВІДАВОЧНЫ «ПЛЮС»

## Карэспандэнт «Звязды» высвятляла, чым прываблiваюць педагогаў у сельскую мясцовасць

**Заполле — адзіная вёска ў Чэрвеньскім раёне, дзе колькасць насельніцтва павялічваецца. Адпаведна, расце колькасць вучняў у мясцовай сярэдняй школе. Але навучальная ўстанова не адчувае праблем з кадрамі. Бадай, не хапае тут толькі настаўнікаў-«замежнікаў» — у класах больш чым па 20 вучняў, іх неабходна падзяляць на групы. Таму хутка калектыў папоўніцца яшчэ адной настаўніцай замежных моў.**

У школе добра замацоўваюцца маладыя спецыялісты. Хтосьці з іх паступаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы па накіраванні, а нехта і сам вырашыў вярнуцца на малую радзіму.

Віталь Палячкоў працуе ў Заполлі другі год. Закончыў Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Аркадзя Куляшова, выкладае гісторыю і грамадазнаўства. У час вучобы ён вывучаў курс археалогіі, а цяпер марыць арганізаваць разам са сваімі выхаванцамі раскопкі. (Па словах Віталя, мясцовыя жыхары знаходзяць у ваколіцах тутэйшых вёсак шмат старадаўніх керамічных вырабаў.) Толькі для ажыццяўлення задуманага патрэбны дазвол Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук і, безумоўна, дапамога спецыялістаў.

Жонка Віталя Вікторыя вучылася ў Магілёўскім універсітэце на дзённым аддзяленні, але перавялася на завочнае. Зараз яна ў дэкрэтным водпуску па доглядзе сына. Палячковы займаюць пакой у інтэрнаце, які выдзелілі ім па хадайніцтве адміністрацыі школы і прафсаюзнага камітэта.

На першы час сям'я забяспечана ўсім неабходным. Ёсць душ, бойлер з гарачай вадой. Гэтыя выгоды абыходзяцца ў 71 тысячу рублёў штомесяц. «Для сямейнага бюджэту — дробязі, бо цэны на здымнае жыллё ў Смілавічах амаль такія, як у Мінску. З фінансавага боку таксама ўсё нядрэнна: зарплата, надбаўкі, дзіцячая дапамога», — кажуць маладыя.

Пасля прыезду на працу спецыялісту выдаткавалі сродкі на першапачатковае ўладкаванне, так званыя «пад'ёмныя», у памеры 10 базавых велічынь. Акрамя таго, Віталь атрымлівае даплату — 4 «базавыя» ў месяц. Мінулай восенню аддзел адукацыі райвыканкама выдзеліў мужу і жонцы па 500 тысяч рублёў на набыццё гароднiны. Сям'я плануе пабудаваць уласнае жыллё за кошт ільготнага крэдыту.

...Людміла Кахновіч у Смілавіцкай сярэдняй школе № 2 — настаўніца музыкі. Прыехала ўслед за мужам, які размеркаваўся ў Смілавічы пасля заканчэння каледжа і працуе майстрам вытворчага навучання ў сельскагаспадарчым ліцэі.

— Мы нарадзіліся і выраслі ў Пінску, вучыліся ў адной школе, пажаніліся, выхоўваем дачушку, якой споўнілася чатыры з паловай гады, — гаворыць Людміла. — Жывём у інтэрнаце ліцэя па дагаворы. Уладкаваліся нядрэнна. Зрэшты, самі можаце паглядзець!

«Уладанні» Кахновічаў — два ўтульныя пакойчыкі агульнай плошчай 32 квадратныя метры. Той, што большы па памерах, гаспадары перагарадзілі — атрымаліся вітальня і жылое памяшканне. Меншы прыстасавалі пад кухню. Змясціліся тут халадзільнік, абедзенны столік, электраплітка і яшчэ шмат якіх бытавых прыстасаванняў. Як маладыя спецыялісты, Людміла з мужам узялі льготны спажывецкі крэдыт і набылі мэблю.

— Збіраецеся застацца?— пацікавілася ў Людмілы.

— Спачатку хацелі вярнуцца дадому, ды падумалі, што не варта: ёсць магчымасць абзавесціся сваім жыллём. Стаім на чарзе ў кааператыве, спадзяёмся на льготны крэдыт. Акрамя таго, падабаюцца калектыў, праца, — кажа Людміла.

— Не хацелася б страціць такога спецыяліста, як Людміла Сяргееўна, — заўважыў дырэктар школы Вячаслаў Марціновіч. — Настаўнікі музыкі ў нас нарасхват.

Наогул, у Смілавіцкую школу выпускнікі сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў размяркоўваюцца з задавальненнем. І амаль усе тут застаюцца. Гэтаму ёсць тлумачэнне. Па-першае, рукой падаць да сталіцы — 24 кіламетры. У Мінск можна дабрацца літаральна за паўгадзіны, кожныя 15 хвілін ходзяць маршрукі. Але галоўная прычына ў тым, што тут клапоцяцца пра маладыя кадры. Акрамя дзяржаўнай падтрымкі, маладыя спецыялісты карыстаюцца льготамі і сацыяльнымі гарантыямі, якія замацаваны ў абласным пагадненні і калектыўных дагаворах. Напрыклад, у адпаведнасці з калдагаворам, на працягу двух гадоў ім штомесяц выплачваецца надбаўка ў памеры 10%, а тым, хто закончыў навучальную ўстанову з «чырвоным» дыпломам — 20% ад аклада. Прафкам садзейнічае ў атрыманні пуцёвак у санаторыі і пансіянаты.



Віталь ПАЛЯЧКОЎ са сваімі вучнямі.

З маладымі спецыялістамі заключаюцца не кантракты, а менавіта бестэрміновыя працоўныя дагаворы. Як паказала практыка, такі падыход садзейнічае замацаванню выпускнікоў. «Моладзь працуе на даверы, імкнецца добрасумленна выконваць свае прафесійныя абавязкі, бо адчувае, што ёй не пагражае звальненне пасля таго, як давядзецца выйсці з катэгорыі маладых спецыялістаў», — лічыць Вячаслаў Марціновіч.

— У раёне толькі 20% работнікаў школ засталося на кантрактнай форме найму, у асноўным тэхперсанал, — кажа старшыня райкама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Віталь Труш. — Кантракты заключаюцца са згоды і па жаданні саміх настаўнікаў.

Усяго на Чэрвеньшчыне працуюць 40 настаўнікаў — маладых спецыялістаў, у тым ліку 25 у райцэнтры і гарадскім пасёлку Смілавічы, 15 — у вёсках. Пры некаторых сельскіх школах таксама ёсць інтэрнаты, але ўмовы тут адрозніваюцца ад гарадскіх. Не ўсім падабаецца самім паліць печку ці кацёл, хадзіць да калодзежа па ваду. Але галоўнае, што па першым часе ў маладога настаўніка ёсць дах над галавой, ды побач няма кватэрнай гаспадыні, якая кантралюе кожны крок... І ўсё ж некаторыя з педагогаў вымушаны здымаць жыллё. І калі раней ім часткова кампенсавалі «кватэрныя», то цяпер гэта адмянілі... А «карані» ў вёсках пускаюць у першую чаргу тыя педагогі, хто сустрэў сваю «палавінку» і вырашыў жыллёвае пытанне.

Побач са Смілавіцкай школай № 2 знаходзіцца цэнтр дзіцячай творчасці.

— Праблемы ў нас напэўна, такія ж, як і ў нашых калег, — адсутнасць жылля, — заўважыла дырэктар цэнтра Ала Шыдлоўская. — Займець куток у інтэрнаце не заўсёды атрымліваецца, а зняць кватэру ці пакой цяжка.

Тым не менш, маладыя спецыялісты спраўляюцца з абавязкамі на «выдатна». Яўгенію Грыневіч уладкавалі ў інтэрнат. Алена Карніенка ездзіць кожны дзень на працу з Мінска, збіраецца атрымаць другую вышэйшую адукацыю. Калі мець на ўвазе невялікі памер зарплаты, то можна сказаць, што ў гэтым цэнтры працуюць сапраўдныя энтузіясты. Але перспектывы для прафесійнага, творчага росту тут ёсць. Ала Леанідаўна Шыдлоўская яшчэ нядаўна таксама лічылася маладым спецыялістам, а сёння ўзначальвае ўстанову дадатковай адукацыі. Цяпер у яе ёсць любімая праца і жыллё. Вось толькі б грошай пабольш...

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*Чэрвеньскі раён.*

■ Пасяўная кампанія

# УСЮДЫХОДЫ ДЛЯ ХЛЕБАРОБАЎ

**— Пасяўная на Віцебшчыне пачалася некалькі тыдняў таму. У вобласці вядзецца падкормка азімых збожжавых, шматгадовых траў і рапсу, — паведамілі ў камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама. — І першымі распачалі сяўбу гаспадаркі Докшыцкага, Чашніцкага, Браслаўскага і Глыбоцкага раёнаў. Агульная пасяўная плошча складае сёлета больш за 870 тысяч гектараў, а 57 працэнтаў з іх зоймуць збожжавыя і зернебабовыя.**

У Докшыцкім раёне для таго, каб лягчэй было працаваць на зямлі падчас вясенняй сяўбы, выкарыстоўваюць тэхнічныя навінкі, зробленыя на Віцебшчыне — у Верхнядзвінскім раёне. Як расказалі ў райвыканкаме, самаходныя апырсквальнікі на пнеўматычных колах «Раса» — сапраўдныя каралі палёў. Як і іх механічныя «браты» — «Дзвіна», універсальны апырсквальнік на шынах-абалонках... Кіраваць такімі «ўсюдыходамі» дапамагаюць камп'ютарныя «начынкі».

А ў Бешанковіцкім раёне пераможцаў спаборніцтваў сярод удзельнікаў пасяўной вырашылі дадаткова прэміраваць. Журы конкурсу ўзначаліў першы намеснік старшыні райвыканкама. Вызначаны і «намінацыі»: падрыхтоўка глебы, сяўба яравых і збожжавых культур, лёну, унясенне мінеральных угнаенняў пад сяўбу яравых культур, азімыя і шматгадовыя травы. Пераможцу гарантаваны 400 тысяч рублёў, за другое месца выплацяць 300 тысяч, 200 тысяч — за трэцяе. У раёне сяўбу збожжавых і зернебабовых культур і лёну плануюць завяршыць да 1 мая.

Добра праведзеная сяўба — гарантыя выдатнага ўраджаю. Пра гэта аграрыі не забываюць. А «расслабіцца» ненадоўга можна будзе, бадай, толькі падчас святкавання «Дажынак».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДЖЭНТЛЬМЕНСКІ ЖЭСТ МАГІЛЁЎСКІХ УЛАД

**Новую тэхніку на пачатку сяўбы атрымалі жанчыны, якія кіруюць сельгаспрадпрыемствамі вобласці.**

Рэгіён атрымаў у лізінг 50 энерганасычаных трактароў, і ключы ад першых 11 з іх **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК** уручыў жанчынам-кіраўнікам сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

— Упэўнены, што трактары будуць эфектыўна працаваць на палях і стануць добрай падмогай у дасягненні высокіх вынікаў.

Пасяўная кампанія, якая стартавала ў Магілёўскай вобласці, сёлета адрозніваецца асаблівай адказнасцю за вынікі. Рэгіён прымае ўвосень «Дажынкі», і кіраўніцтва настойвае на безумоўным выкананні прагнозных паказчыкаў.

На ўрачыстай цырымоніі перадачы новых трактароў жанчыны, якія кіруюць сельскімі гаспадаркамі, выказалі падзяку дзяржаве за падтрымку. Вяскоўцы гатовы працаваць, каб атрымаць добры хлеб. Праваслаўны святар блаславіў новую тэхніку і механізатараў на добры шлях. Пётр Руднік пажадаў добрага надвор'я і дапамогі неба.

Тэхніка да пасяўной кампаніі гатова, праца арганізавана, і сяўба ў Магілёўскай вобласці набірае абароты. Паводле інфармацыі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама, на раніцу панядзелка 16 красавіка засеяны 3% плошчаў, і большасць сельскіх раёнаў (за выключэннем 4-х) распачала сяўбу.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Зваліўся ў калодзеж

**«У калодзежы знаходзіцца чалавек, самастойна выбрацца не можа». Такі сігнал позна ўвечары прынялі супрацоўнікі Лагойскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях з вёскі Мачаны.**

Аказалася, што 52-гадовы мужчына, рабочы аднаго з мінскіх заводаў, нападпітку даставаў вядро вады і... упаў у калодзеж. Выратавальнікі дасталі пацярпелага, а супрацоўнікі медыцынскай службы рэспубліканскага атрада асаблівага прызначэння аказалі яму ўрачэбную дапамогу. З дыягназам «агульнае пераахаладжэнне» мужчыну даставілі ў Мінскую абласную клінічную бальніцу.

## Аўтобус урэзаўся ў ліхтар. Кіроўца памёр

**Незвычайнае дарожна-транспартнае здарэнне адбылося днём у нядзелю ў сталіцы. Тут аўтобус «МАЗ-103» урэзаўся ў мачту вулічнага асвятлення. Кіроўца памёр.**

Аварыя здарылася на вуліцы Філімонава, на прыпыначным пункце «Медсанчастка». Аўтобус належаў прадпрыемству «Мінсктранс» і ехаў па маршруце №87С — «ДС Зялёны Луг-3» — ДС «Аўтазаводская». У выніку адзін чалавек пацярпеў і быў дастаўлены ў бальніцу з траўмамі. Яшчэ 14 пасажыраў аўтобуса самастойна пакінулі салон. Мяркуецца, што ў 50-гадовага кіроўцы здарыўся прыступ эпілепсіі. Падчас рэанімацыйных мерапрыемстваў у аўтамабілі медыкаў мужчына памёр. Падраздзяленні МНС правялі работы па ліквідацыі пагрозы падзення мачты.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Бяспека на дарозе

# АЎТАМАБІЛІ ПРАЛАМАЛІ АГАРОДЖУ

**За святочныя выхадныя дні на дарогах Магілёўскай вобласці адбыліся ДТЗ, у якіх пацярпелі людзі.**

15 красавіка ў Чэрыкаве сутыкнуліся два аўтамабілі. «Сеат», за рулём якога быў 46-гадовы мужчына, не саступіў дарогу «Фальксвагену», якім кіраваў 38-гадовы мясцовы жыхар. Мікрааўтобус паваліўся на бок, аўтамабілі пашкодзілі агароджу прыватнага дома. У выніку з чэрапна-мазгавымі траўмамі і пераломамі шпіталізаваны абодва вадзіцелі, а таксама 36-гадовая і 16-гадовая пасажыркі «Фальксвагена».

За два дні супрацоўнікі ДАІ ў Магілёўскай вобласці выявілі 960 парушэнняў правілаў дарожнага руху. Затрыманы і адхілены ад кіравання транспартам 58 нецвярозых вадзіцеляў.

**Ілона ІВАНОВА**



Фота Магілёўскай ДАІ.

## Прыйшоў да чужой жонкі...

Злачынства здзейснена ў пасёлку Садовы, каля Пінска. Паводле версіі следства, 36-гадовы жыхар Пінска прыйшоў у пакой аднаго з інтэрнатаў да сваёй знаёмай. Жанчыны ў гэты момант дома не было, быў толькі яе 28-гадовы муж. Мужчыны пасварыліся, распачалася бойка, у выніку якой старэйшы задушыў малодшага падушкай. Забойца затрыманы.

**Яна СВЕТАВА.**

# КАТАФАЛК І МУЗЫКА ДЛЯ ЛЮБІМЦА ТУЗІКА

## Праз два тыдні ў Беларусі адкрыюцца першыя легальныя могілкі для хатніх жывёл




**З А мяжой чатырохногіх сяброў у апошні шлях праводзяць з шыкам. Цела коціка ці сабачкі дастаўляюць на спецыялізаваныя могілкі пад жалобную музыку, не шкадуюць грошы ні на труну з чырвонага дрэва ці хрусталю, ні на надмагільныя скульптуры, ні на мармуровыя помнікі. Хоць Беларусь і знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, але ж у нас пахавальны сэрвіс для хатніх жывёл пакуль не настолькі развіты. Ды і не памылюся, калі скажу, што не ўсе беларусы разумеюць, навошта патрэбны такія паслугі, лічачы гэта дзівацтвамі багатых. Тым не менш, і ў нашай краіне ёсць людзі, якія хацелі б па-чалавечы развітацца са сваімі «мурзікамі» ды «тузікамі».**

### «Я гатова заплаціць за тое, каб мой любімец быў пахаваны цывілізавана»

Год таму рыжы пушысцік маёй сяброўкі выскачыў на дарогу і трапіў пад машыну. Спачатку думалі закапаць любімца ў суседнім парку пад дрэвам. Але знаёмыя параілі пахаваць коціка на нелегальных могілках, якіх у Мінску дастаткова. Самыя вядомыя і маштабныя знаходзяцца ў мікрараёне Уручча.

Сярод калматых елак, што растуць уздоўж дарогі, — некалькі дзясяткаў мініяцюрных магілак кошак, сабак, папугайчыкаў і нават пародзістых трусоў. На адным пагорку нават крыж паставілі. На астатніх — усё больш кветкі, фотаздымкі гадаванцаў, пластмасавыя і металічныя місачкі, любімыя цацкі, шыльдачкі з цёплымі словамі памяці: «Спі спакойна, мой самы верны сябра», «Мы заўсёды будзем цябе памятаць»... Што здзівіла, над асобнымі магілкамі ўзвышаюцца самыя сапраўдныя гранітныя пліты з выявай любімца і гадамі яго жыцця, эпітафіяй. Не кожнаму чалавеку ставяць такі дабротны помнік...

Там сярод мініяцюрных пагоркаў я сустрэла Таццяну, якая пасля працы выгульвала свайго чорнага пудзеля. Разгаварыліся. Жанчына выказала сваё адмоўнае стаўленне да такіх вось стыхійных могілак. «Самі бачыце, не ўсе магілкі дагледжаныя, відаць, што толькі асобныя гаспадары рэгулярна сюды наведваюцца. А тут жа праезная частка побач, дзеці ходзяць. Лепш бы адкрылі афіцыйныя могілкі для братоў нашых меншых. Дык, можа, быў бы парадак. Магчыма, нехта назаве гэта дзівацтвам, але, шчыра кажучы, я гатова заплаціць за тое, каб мой любімец быў пахаваны цывілізавана. Думаю, я такая не адна».

...З'яўленнем падобных нелегальных могілак хатніх жывёл усур'ёз заклапочаны і санітарныя службы. Маўляў, яшчэ невядома, ад чаго памёр закапаны ў зямлю коцік ці сабачка. Паводле слоў спецыялістаў, некаторыя хваробы могуць быць небяспечныя як для жывых сабак, якія могуць разрыць магілку, так і для чалавека. Таму не дзіўна, што за такое пахаванне беларускім заканадаўствам для парушальнікаў прадугледжаны немаленькі штраф (у правілах утрымання жывёл ёсць пункт, які забараняе хаваць і выкідваць памерлых жывёл. — **Н.Д.**). Праўда, сумняваюся, што хтосьці з тых гаспадароў яго плаціў. Як кажуць, не злоўлены не злодзей...

### «Разумею гаспадароў, якія не хочуць, каб іх гадаванца спалілі ў агульнай яме»

Незаконным могілкам, як праінструктавалі мяне ў сталічным прытулку для сабак і кошак «Фаўна горада», сёння ёсць толькі адна законная альтэрнатыва.

Так, грамадзянін, калі ў яго памёр сабака, кошка ці папугайчык, па правілах павінен прынесці цела на Гурскага, 42. Там жа безнадзейна хворага гадаванца за асобную плату могуць і гуманна ўсыпіць. Пасля чаго пакладуць у пакет і ўтылізуюць у спецыяльнай біяметрычнай яме, што знаходзіцца пад Мінскам у вёсцы Дзегцяроўка.

Кошт паслугі залежыць ад вагі жывёліны. Да прыкладу, пахаванне ў перапоўненай яме 10-ці кілаграмовага сабакі абыдзецца ў 70 тысяч рублёў, разам з усыпленнем — у 177 тысяч. Зразумела, пра тое, каб наведаць магілку ката ці сабакі, і гаворкі няма.




— Я выдатна разумею тых гаспадароў, якія не хочуць, каб яго любімца разам з іншымі трупамі жывёл скінулі ў яму, палілі хімікатамі для дэзынфекцыі і спалілі, — кажа **намеснік дырэктара сталічнага прадпрыемства па часовым утрыманні жывёл «Фаўна горада» Тамара ЦАРЫКОЎСКАЯ**. — Бо для многіх людзей кот ці сабака, якія пражылі з імі не адзін год, — сапраўдны член сям'і, з якім пасля смерці хочацца развітацца па-чалавечы. І ў гэтым няма нічога дзіўнага.

Праблема з'яўлення могілак для хатніх жывёл узнікла ў краіне даўно. І асабліва востра яна стаіць для Мінска, дзе кошкі, сабакі ці папугаі жывуць у дзясятках тысяч кватэр.

— Таму мы ўжо не першы год выбіваем зямлю, каб даць магчымасць мінчанам пахаваць жывёл на платнай аснове цывілізавана, — кажа Тамара Царыкоўская. — Неаднаразова звярталіся ў Мінгарвыканкам, Мінрайвыканкам. У адказ пачулі, што няма падыходзячага месца. Нашы аднадумцы з Цэнтра рытуальных паслуг для хатніх жывёл пайшлі іншым шляхам, і ім пашанцавала больш...

### Каля 500 тысяч рублёў — за пахаванне па-чалавечы

Знайсці зямлю пад могілкі для жывёл, паводле слоў **аднаго з заснавальнікаў цэнтра рытуальных паслуг для хатніх жывёл «Біяэкалогія» Віталя ПТАШЫНСКАГА,** было сапраўды не так проста.

— Калі зразумелі, што ў Мінску і Мінскім раёне нам у бліжэйшы час нічога не свеціць, пачалі штудзіраваць іншыя раёны, — кажа Віталь Пташынскі. — Складана было знайсці чыноўніка, які б паставіўся да праблемы з разуменнем. Давялося пачуць шмат адмоўных адказаў. Паразумення дасягнулі толькі з адміністрацыяй Смалявіцкага раёна. Менавіта на тэрыторыі гэтага раёна з мая гэтага года і пачнуць працаваць першыя ў Беларусі афіцыйныя могілкі для хатніх жывёл.

**— Што яны будуць сабой уяўляць?**

— Гэта будзе засаджаны газонам і агароджаны ўчастак зямлі з вартоўняй. На ім будуць пракладзены сцяжынкі і ўзведзена калумбарная сцяна. Могілкі будуць разлічаны на 8 тысяч магіл і 10 тысяч ячэек у калумбарыі.

Што тычыцца цэн, то адправіць у апошні шлях свайго любімца абыдзецца ў капеечку. Так, за выклік агента цэнтра рытуальных паслуг дадому і дастаўку жывёліны давядзецца заплаціць 45 тыс. рублёў (каб зэканоміць, можна даставіць і самому. — **Н.Д.**), за крэмацыю — 425 тыс., пахаванне ў магіле — 425 тыс. рублёў. Скрыня для пахавання будзе каштаваць ад 30 да 60 тыс. рублёў. За дадатковую плату можна будзе замовіць нават помнік.

**— А на які тэрмін разлічана пахаванне?**

— Кожнае пахаванне будзе разлічана на тры гады. У тым выпадку, калі гаспадар жывёліны пажадае захаваць месца на могілках пасля заканчэння гэтага тэрміну, ён павінен будзе даплаціць кошт пахавання.

**— Цэны немаленькія...**

— Але яны ў 2-3 разы ніжэй, чым, напрыклад, у Расіі. Больш за тое, даплачваць за захаванне месца расіяне вымушаны штогод.

Пры вызначэнні кошту паслуг улічвалася патрэба забяспечваць належны догляд за магіламі і выплачваць зарплату персаналу. У штат могілак увойдзе дзевяць чалавек: вартаўнікі, агенты цэнтра рытуальных паслуг і рабочыя, якія будуць праводзіць крэмацыю і хаваць жывёл.

— Да слова, ужо зараз многія мінчане замаўляюць у нашым цэнтры індывідуальную крэмацыю, — адзначыў Віталь Пташынскі. — Скрыню з прахам любімца мы вяртаем гаспадарам, яны таксама могуць пакінуць яе ў нас да адкрыцця калумбарыя.

Атрымліваецца, што паслугі афіцыйных могілак будуць па кішэні не кожнаму, але ў заможных мінчан цывілізаваны «пагост», перакананы бізнэсмены, будзе карыстацца попытам. А вось ці вырашыць ён праблему несанкцыянаваных могілак жывёл — вялікае пытанне...

**Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.**

## Дарэчы

✓ **Калі душа патрабуе ўвекавечыць памяць гадаванца, але кашалёк не вытрымае ўстаноўкі мармуровага пастамента, можна пахаваць любімца віртуальна. У інтэрнэце ёсць спецыяльныя сайты, дзе любы карыстальнік бясплатна можа размясціць фотаздымак коціка ці сабачкі, запаліць свечку і запісаць успаміны аб шчаслівых момантах, праведзеных разам.**

## А ВЫ ВЕДАЛІ, ШТО...

✓ **Першыя ў свеце могілкі для хатніх жывёл адкрыліся ў амерыканскім горадзе Хартсдэйл, у штаце Нью-Ёрк. Усё пачалося з таго, што мясцовы ветэрынар прапанаваў свайму сябру, у якога памёр сабака, невялікі ўчастак зямлі ў сваім яблыневым садзе, каб пахаваць жывёліну. Зараз там больш за 70 тысяч магіл.**

✓ **Крыху пазней, у 1899 годзе, могілкі для сабак адкрыліся ў Парыжы — яны сталі першымі ў Еўропе. Тады ў французскай сталіцы выйшаў закон, які забараняў выкідваць трупы хатніх жывёл на памыйніцу. У заходніх краінах пахаванне хатніх жывёл даўно ператварылася ў прыбытковы бізнэс. Гаспадары могуць замовіць па сваім гадаванцы аркестр і шыкоўны помнік, наняць плакальшчыкаў — адным словам, арганізаваць такую развітальную цырымонію, якой могуць пазайздросціць і людзі.**

✓ **Цікава, што задоўга да з'яўлення еўрапейскіх могілак для жывёл у Расіі ўжо існавалі адзіныя ў свеце могілкі для коней. У 1826 годзе Мікалай І выдаў указ аб стварэнні своеасаблівага «дома састарэлых» для заслужаных коней. Пенсійную стайню арганізавалі ў Царскім Сяле. Першым тут пахавалі вернага каня Аляксандра І па мянушцы L'Ami (Сябар). Пасля колькасць пахаванняў павялічылася да 122.**

✓ **У Старажытным Егіпце, калі ў хаце памірала кошка, уся сям'я ў знак жалобы збрывала бровы. Хавалі ж чатырохногіх гадаванцаў з ушанаваннямі, як людзей. Так, пры раскопках у храме багіні радасці Бастэт было знойдзена некалькі тысяч каціных мумій, побач з якімі ляжалі забальзамаваныя мышы — каб у замагільным жыцці любімцы не ведалі ні ў чым патрэбы.**

✓ **У Амерыцы пры жаданні можна з попелу любімага сабакі зрабіць штучны брыльянт і ўставіць у пярсцёнак.**

✓ **Наогул у ЗША існуе культ хатніх жывёл пры жыцці і пасля смерці. Так, да прыкладу, у Вашынгтоне некаторыя святары праводзяць месы для жывёл, а на святочных службах у дзень заступніка ўсіх жывёл святога Францыска Асізскага можна ўбачыць сабак, кошак, трусоў, чарапах і нават вярблюдаў. У гэты дзень гаспадары жывёл моляцца за здароўе чатырохногіх любімцаў.**

